ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 38-ы
№ 24 (2384)
25 сакавіка 1969 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ДАЎНЯЯ і цесная дружба яднае камсамол і савецкіх пісьменнікаў. Адной з форм праяўлення гэтай дружбы — традыцыйныя ўсесаюзныя нарады маладых літаратараў, якія праводзяцца Саюзам пісьменнікаў СССР і ЦК ВЛКСМ. Гэтыя нарады служаць не толькі ўмацаванню творчых і дзелавых кантактаў паміж камсамолам і літаратурнай моладдзю для сумеснай работы па ідэйна-эстэтычным выхаванні падрастаючага пакалення. Яны сталі і добрай школай для маладых літаратараў, школай, якая спрыяе іх ідэйнай загартоўцы і творчаму росту.

За пасляваенны час былі праведзены чатыры ўсесаюзныя нарады маладых пісьменнікаў. Першая з іх адбылася ў 1947 годзе, другая — у 1951, трэцяя—у 1956 і чацвёртая — у 1963 годзе. Іх удзельнікамі былі 944 дэлегаты — паслапцы літаратурнай моладзі з усіх рэспублік, краёў і абласцей нашай радзімы. Больш як 250 з іх неўзабаве сталі членамі Саюза пісьменнікаў СССР, парадавалі чытачоў змястоўнымі і цікавымі творамі.

Удзельнікамі ўсесаюзных форумаў маладых пісьменнікаў былі ў розны час і многія беларускія літаратары. Так, сярод дэлегатаў першай нарады былі І. Мележ, А. Кулакоўскі, К. Кірэенка і Д. Каваліў. У рабоце другой нарады прымалі ўдзел М. Аўрамчык, Я. Брыль, А. Васілевіч, Б. Бур'ян, М. Данілепка, М. Гамолка, А. Макаёнак, А. Рылько і А. Пысін. На трэцяй нарадзе былі прадстаўнікі новага пакалення беларускіх літаратараў—С. Гаўрусёў, Н. Гілевіч, В. Вольскі, П. Васілеўскі, А. Карпюк, Н. Кіслік, П. Макаль і А. Махнач. Нарэшце, у рабоце чацвёртага ўсесаюзнага форума маладых пісьменнікаў удзельнічалі Р. Барадулін, Г. Бураўкін, А. Грачанікаў, М. Маляўка, У. Паўлаў, М. Стральцоў, Р. Тармола, І. Шальманаў.

Сёння ў Маскве пачынае сваю работу пятая Усесаюзная нарада маладых пісьменнікаў. Напярэдадні яе адкрыцця наш карэспандэнт гутарыў з другім сакратаром праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. Шамякіным.

— Іван Пятровіч, кім будзе прадстаўлена на ўсесаюзнай нарадзе літаратурная моладзь нашай рэспублікі?

— З Беларусі на нараду едуць Данута Бічэль-Загнетава, Сяргей Панізнік, Мар'ян Дукса, Жэня Янішчыц, Анатоль Кудравец, Мікола Капыловіч, Валянцін Мыслівец і Варлен Бечык.

Данута Бічэль-Загнетава — член Саюза пісьменнікаў, даволі вопытная і сталая паэтэса, аўтар некалькіх кніжак для дарослых і дзяцей. Яе добра ведае наш чытач. Паэзія яе самабытная, поўная шчырага пачуцця, блізкая да народнай паэзіі.

Хораша заявіў аб сабе сваёй першай паэтычнай кнігай «Кастры купалля» Сяргей Панізнік. Яго вершы прываблiваюць увагу актыўным стаўленнем да жыцця, любасцю да роднай прыроды, пашанай да духоўнай спадчыны продкаў. Мар'яна Дуксу, аднаго з самых маладых членаў нашай пісьменніцкай арганізацыі, чытачы ведаюць па зборніку вершаў «Спатканне», які выйшаў у 1967 годзе.

Вершы Жэні Янішчыц упершыню з'явіліся ў рэспубліканскім друку гады чатыры назад, калі яна была яшчэ вучаніцай дзесятага класа. І гэтыя вершы адразу звярнулі на сябе ўвагу аматараў нашай паэзіі шчырасцю, празрыстасцю пачуцця, светласцю настрою. Цяпер Жэня вучыцца на трэцім курсе універсітэта, шмат піша, актыўна друкуецца, падрыхтавала да друку сваю першую кнігу.

Вельмі прыязна сустрэла крытыка першую кнігу Анатоля Кудраўца «На зялёнай дарозе». Малады празаік з вялікай увагай, цеплынёй і пранікнёнасцю піша пра сваіх герояў — звычайных, простых людзей вёскі.

Летась выйшла з друку першая кніга Міколы Капыловіча — зборнік апавяданняў «Скрозь жывую людзі». Гэтая кніга—пра цяжкое пасляваеннае жыццё аднагодкаў пісьменніка, пра жыццё сучаснай інтэлігенцыі. З вялікай любасцю паэтызуе аўтар прыроду роднага Палесся.

Валянцін Мыслівец шмат гадоў працаваў на заводзе і адначасова вучыўся. Мусіць таму ён настойліва распрацоўвае ў сваёй творчасці тэму рабочага класа, тэму заводскіх будняў.

Урэшце, прыемна адзначыць, што ў нарадзе прымае ўдзел і прадстаўнік нашай маладой крытычнай думкі—Варлен Бечык. Ужо некалькі гадоў ён актыўна выступае ў друку з артыкуламі і рэцэнзіямі. Малады крытык піша пераважна аб паэзіі, піша ўдумлива, з любоўю, з пачуццём адказнасці, прафесіянальна.

Іх — Дануту Бічэль-Загнетаву, Сяргея Панізніка, Мар'яна Дуксу, Жэню Янішчыц, Анатоля Кудраўца, Міколу Капыловіча, Валянціна Мысліўца і Варлена Бечыка — Саюз пісьменнікаў БССР і Цэнтральны Камітэт ЛКСМБ рэкамендавалі для ўдзелу ў рабоце ўсесаюзнай нарады маладых пісьменнікаў. Думаецца, што ўсе яны — вартыя прадстаўнікі нашых маладых літаратурных сіл.

Само сабой зразумела, што яны—толькі невялікая частка, невялікая рачулка з той шырокай плыні юных талентаў, якая штогод уліваецца ў нашу літаратуру. А гэтая маладая плынь сапраўды шырокая. Дастаткова сказаць, што за дзесяць апошніх гадоў у члены Саюза пісьменнікаў рэспублікі прынята больш чым 90 маладых празаікаў, паэтаў, драматургаў, крытыкаў, літаратуразнаўцаў, перакладчыкаў. Гэта гаворыць аб тым, што літаратура наша расце, развіваецца, набывае новыя крылы і новыя абсягі. Моладзь — будучыня нашай літаратуры. І хораша, што будучыня гэтая абяцае быць добрай.

— Вось вы сказалі: моладзь—будучыня нашай літаратуры. Ці не маглі б вы сказаць больш падрабязна пра маладых пісьменнікаў? Чым яны вас радуюць і чым засмучаюць?

— На нашых вачах многія былыя пачаткоўцы і маладыя літаратары становяцца сталымі, сур'ёзнымі майстрамі нашай літаратуры. Для прыкладу спынюся на адным пакаленні. Міхась Стральцоў, Барыс Сачанка, Вячаслаў Адамчык, Іван Пташнікаў, Іван Чыгрынаў, Уладзімір Дамашэвіч, Рыгор Барадулін, Генадзь Бураўкін, Янка Сіпакоў, Юрась Свірка... Па інерцыі мы ўсё называем іх маладымі. А між тым ад гэтай інерцыі даўно пара адмовіцца, бо ўсе яны— вопытныя, сталыя літаратары. Яны паспелі шмат зрабіць у нашай літаратуры, без іх творчасці проста немагчыма ўявіць нашу сённяшнюю паэзію і прозу.

Пра тых, хто ідзе следам, я ўжо крыху гаварыў. Гэта тыя ж Данута Бічэль-Загнетава, Сяргей Панізнік, Мар'ян Дукса, Мікола Капыловіч, Анатоль Кудравец, Валянцін Мыслівец. А іх, у сваю чаргу, падпіраюць новыя маладыя сілы, новыя таленты, якія з кожным годам заяўляюць аб сабе усё гучней і ўпэўненей. Можна назваць тут дзесяткі імёнаў: Рыгор Семашкевіч, Сымон Блатун, Хведар Чэрня, Казімір Камейша, Вольга Іпатава, Юрка Голуб, Алесь Разанаў, Сяргей і Валеры Законнікавы, Алесь Жук, Леанід Калодзежны, Віктар Дайліда, Алесь Шлег... Пералічыць усіх проста немагчыма. А штогод мы бачым новыя імёны, чуем новыя галасы— як у паэзіі, так і ў прозе.

(Заканчэнне на 3-й стар.).

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

Пакуль вы маладыя...

На пытанні карэспандэнта «Літаратуры і мастацтва» адказвае сакратар праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. ШАМЯКІН.

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ БТА

Аб ганаровых задачах, якія стаяць цяпер перад савецкім тэатрам, аб высокай адказнасці творчых работнікаў гаварылася ўчора на пленуме праўлення Беларускага тэатральнага аб'яднання. Даклад «Задачы тэатраў рэспублікі ў сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна» зрабіў намеснік міністра культуры БССР Ю. Міхневіч.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел галоўныя рэжысёры тэатраў Б. Ганага (тэатр юнага гледача), І. Папоў (Гомельскі абласны), С. Казіміроўскі (тэатр імя Я. Коласа), А. Струнін (Гродзенскі абласны), галоўны рэжысёр Беларускай дзяржаўнай філармоніі Ю. Ужанцаў, артыст Брэсцкага тэатра імя ЛКСМБ Ю. Уласаў, дырэктар тэатра імя Я. Купалы І. Міхалюта, драматург К. Губарэвіч, мастацтвазнаўца А. Сабалеўскі, супрацоўнік БТА М. Гульман.



ПРЫЕМНА працаваць на машыне, якая не толькі зручная, магутная і надзейная, але і прыгожая. Такія машыны, зробленыя на Гомельскім заводзе сельскага машынабудавання, працуюць на палях Беларусі, Украіны, Казахстана, Сібіры...

Зараз у лабараторыі мастацкага канструявання Гомсельмаша распрацоўваецца знешні выгляд і размяшчэнне вузлоў новага сіласаўборачнага камбайна КНС-1,8.

На здымку — кіраўнік лабараторыі інжынер-канструктар Аляксандр Яўсееў (злева) і слесар-мадэліст Уладзімір Гарбачэнка за падрыхтоўкай макета новага камбайна.

Фота Ул. МЯЖЭВІЧА.

НОВЫЯ НАРОДНЫЯ

За творчыя поспехі ў развіцці музычнага, харавога, вакальнага і цыркавога мастацтва і актыўную канцэртна-выканаўчую дзейнасць прэзідыум Беларускага рэспубліканскага савета прафсаюзаў прысвоіў ганаровыя званні народных новым калектывам мастацкай самадзейнасці — жаночаму вакальнаму ансамблю аддзела галоўнага тэхнолага Мінскага аўтазавода, духавому аркестру Гомельскага палаца культуры чыгуначнікаў імя У. І. Леніна, цыркавому калектыву таго ж палаца і харавой капэле вучэбна-вытворчага прадпрыемства Беларускага таварыства сляпых.

Народны жаночы вакальны ансамбль пры аддзеле галоўнага тэхнолага ордэна Леніна Мінскага аўтазавода быў створаны ў 1962 годзе. Яго заснавальнікам і пастаянным кіраўніком стаў студэнт Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі Яўген Рэутовіч.

Нягледзячы на невялікі састаў— ансамбль аб'ядноўвае 18 інжынераў, канструктараў, тэхнікаў аддзела галоўнага тэхнолага завода — гэты самадзейны калектыў заваяваў шырокую папулярнасць і прызнанне сярод рабочых і служачых прадпрыемства. Артысты ансамбля часта выступаюць у заводскім палацы культуры, выязджаюць з канцэртамі ў падшэфныя калгасы і саўгасы Мінскай вобласці. Рэпертуар у ансамбля немалы — больш 40 твораў розных жанраў. Тут беларускія народныя і сучасныя песні, песні кампазітараў братніх рэспублік, класічныя творы. Усе яны выконваюцца з высокім майстэрствам. Народны вакальны ансамбль неаднаразова ўдзельнічаў у гарадскіх і абласных аглядах мастацкай самадзейнасці. За сваё выканаўчае майстэрства быў узнагароджаны ганаровымі прызамі. Высокую адзнаку народны ансамбль атрымаў на рэспубліканскім аглядзе самадзейнага мастацтва, прысвечаным 50-годдзю БССР і Кампартыі Беларусі.

Зараз калектыў рыхтуе новую праграму да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.

□

Няма такога вечара або свята, у якім бы не ўдзельнічаў народны духавы аркестр Гомельскага палаца культуры чыгуначнікаў імя Леніна (кіраўнік — Ю. Ягудзін). Ён арганізаваўся адразу пасля Вялікай Айчыннай вайны. Неаднаразова аркестр з поспехам выступаў у Мінску, у клубах і дамах культуры многіх раёнаў рэспублікі. У 1967 годзе калектыў аркестра стаў дыпламантам Усесаюзнага фестывалю мастацкай самадзейнасці і быў узнагароджаны памятным медалём.

Зараз у рэпертуары гэтага старэйшага духавога аркестра налічваецца больш як 200 музычных твораў. Аркестр часта выступае з канцэртамі перад рабочымі і служачымі лінейных станцый, бывае ў пасёлках чыгуначнікаў.

□

Захапленне цыркавым мастацтвам не вельмі частая з'ява ў жыцці самадзейных калектываў. Але вось майстар спорту, заслужаны трэнер БССР А. Гінзбург здолеў сабраць пры Гомельскім палацы культуры чыгуначнікаў імя Леніна такі калектыў, якому зараз прысвоена ганаровае званне народнага.

Свае першыя крокі гэты калектыў зрабіў у 1962 годзе. Ён быў створаны на базе акрабатычнага гуртка палаца культуры. Зараз народны цыркавы калектыў налічвае ў сваім складзе 65 чалавек. Гэта — рабочыя, служачыя чыгуначнага вузла, вучні старэйшых класаў.

У 1967 годзе калектыў стаў лаўрэатам Усесаюзнага фестывалю цыркавога мастацтва, а праз год зноў пацвердзіў сваё майстэрства, заваяваўшы дыпломы гарадскога і абласнога аглядаў.

Выхаванцы гэтага калектыву А. Волчак, В. Рузанаў, А. Максіменка, М. Бязручанка сталі прафесіянальнымі артыстамі цырка, а В. Радзянка, В. Плашкоў, В. Смаліцкі, Ф. Фядосік і іншыя атрымалі званне майстроў спорту СССР па акрабатыцы.

□

Народная харавая капэла вучэбна-вытворчага прадпрыемства Беларускага таварыства сляпых (мастацкі кіраўнік Д. Гольдберг) сваім выканаўчым майстэрствам пакарыла многіх слухачоў.

Спачатку ў гэтым калектыве было каля двух дзесяткаў аматараў харавых спеваў. З часам ён большаў колькасна, узрастала яго майстэрства. У рэпертуары народнай капэлы — беларускія, рускія, украінскія харавыя творы, творы музычнай класікі.

Капэла неаднаразова адзначалася дыпломамі і граматамі на гарадскіх і рэспубліканскіх аглядах самадзейнасці.

ТЫДЗЕНЬ ДЗІЦЯЧАЙ КНІГІ

З пачаткам веснавых канікул у нашай рэспубліцы, як і па ўсёй краіне, пачаўся традыцыйны Тыдзень дзіцячай кнігі.

Каля 500 вучняў мінскіх школ сабраліся на сваё свята ў сталічным Палацы піянераў. На сустрэчу з юнымі аматарамі кнігі сюды прыйшлі С. Грахоўскі, А. Вольскі, Э. Агняцвет, В. Зуёнак. Яны расказалі прысутным аб апошніх навінках беларускай дзіцячай літаратуры, прачыталі ім вершы, пазнёмілі са сваімі творчымі планамі. А затым многія ўдзельнікі сустрэчы набылі для сваіх асабістых і школьных бібліятэк творы з аўтографамі аўтараў.

Вялікае свята дзіцячай кнігі адбылося ў Палацы культуры прафсаюзаў. У ім удзельнічалі пісьменнікі І. Грамовіч, Э. Валасевіч, Е. Лось. Яны прачыталі дзецям новыя творы, расказалі, над чым зараз працуюць у дні падрыхтоўкі да знамянальнага юбілею — 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна, падаравалі ўдзельнікам свята свае кнігі.

У Мінскай дзіцячай абласной бібліятэцы адбыўся вечар юных аматараў кнігі, на якім выступіў С. Шушкевіч.

У панядзелак у дзень больш за 400 вучняў мінскіх школ сабраліся ў кінатэатры «Піянер». Тут іх чакала цікавая сустрэча з пісьменнікамі Ф. Жычкам і М. Скрыпкам. Свята дзіцячай кнігі адкрылі дзеці. Яны прачыталі вершы любімых паэтаў, паказалі інсцэніроўку «Любіце і беражыце кнігі».

Пісьменнікі У. Карпаў, А. Русак, В. Зуб, В. Хомчанка, Г. Шыловіч, К. Цвірка, А. Махнач і многія іншыя пабывалі ў школах нашай сталіцы, у клубах, бібліятэках, Дамах культуры.

Тыдзень дзіцячай кнігі з вялікім поспехам праходзіць у Гомелі, Магілёве, Брэсце, Гродна, Віцебску і іншых гарадах рэспублікі.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ!

За заслугі ў развіцці беларускага савецкага тэатральнага мастацтва і ў сувязі з сямідзесяцігоддзем з дня нараджэння народнага артыстка Беларускай ССР Галіна-Аляксандроўская Вольга Уладзіміраўна Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

□

За плённую работу ў галіне беларускай савецкай літаратуры і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння літаратурны крытык Шкраба Рыгор Васільевіч узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

ЦЕРАКЛІЧКА СЕЛЬСКІХ КЛУБАЎ

ХТО ЗАПАЛЬВАЕ ЗОРКІ

Ала ЯСЬКІНА,
член савета Каралёўскага клуба, загадчыца бібліятэкі

УЖО ГАДОЎ пятнаццаць працую я ў клубе. І з кожным годам адчуваю, што работа становіцца больш шматгранная, складанай. З ростам эканомікі нашага калгаса «Запаветы Ільіча» расце і культурны ўзровень жыхароў сяла, растуць іх запатрабаванні. Гэта абавязвае нас шукаць новыя формы і метады культурна-асветнай работы, каб яна была змястоўнай, выклікала цікавасць і актыўнасць людзей, каб не было пасіўных наведвальнікаў нашых мерапрыемстваў.

Для гэтага, вядома, патрэбна перш за ўсё асабістая ініцыятыва работнікаў клуба. Але адзін усяго не зробіш. Плануючы работу нашага Каралёўскага сельскага клуба, мы заўсёды разлічваем на дапамогу грамадскасці, сельскай інтэлігенцыі. У нас ужо сталі традыцыйнымі святы зімы і вясны, Дні работнікаў сельскай гаспадаркі, вечары, прысвечаныя маладым хлебаробам, дыспуты, канферэнцыі. Чатыры гады працуе «Клуб цікавых сустрэч». Хіба ж можна ўсё гэта арганізаваць без дапамогі актыву? Вядома, не.

Штабам, «мазгавым цэнтрам» клуба з'яўляецца савет. Сярод яго членаў — старшыня калгаса Генадзь Левін, сакратар партарганізацыі Яўген Бруеў, дырэктар мясцовай васьмігодкі Віктар Гатоўчык, настаўніца Зінаіда Сударава, важак сельскай камсамоліі Люба Калакольчыкава і іншыя. Кожны член савета клуба адказвае за пэўны ўчастак. В. Гатоўчык — за лекцыйную прапаганду, Я. Бруеў — за наглядную агітацыю, З. Сударава — за работу з дзецьмі і г. д.

Вось, напрыклад, як мы арганізоўваем гулянні. Спачатку распрацоўваем агульны сцэнарый, абмяркоўваем яго на пасяджэнні праўлення калгаса, даём рэкамендацыі брыгадам. Але ў рэкамендацыях не распісваем усё да дробязей. Вызначаецца, калі можна так сказаць, толькі галоўны напрамак, робіцца «каркас». А потым ужо самі ўдзельнікі праяўляюць ініцыятыву, знаходлівасць.

Цікава прайшло, багата было рознымі мерапрыемствамі святкаванне 50-гадовага юбілею рэспублікі і Кампартыі Беларусі. Запомнілася свята «Беларуская бярозка». Нядаўна адсвяткавалі праводзіны зімы. Зараз рыхтуемся гукаць вясну. Стала добрай традыцыяй калектыўна адзначаць Дзень рыбака. Дзень паляўнічага і іншыя святы.

Народныя гулянні даюць магчымасць пашырыць сферу ўплыву сельскага клуба, бо ў іх прымаюць удзел сотні людзей. І скажу шчыра, вельмі гэта прыемна, калі ўдзельнікі гулянняў самі становяцца зацейнікамі, танцорамі, музыкантамі. А здараецца гэта таму, што мы не засушваем свае «мерапрыемствы», не абмяжоўваем іх сценамі клуба. З дапамогай шырокага актыву знаходзім шляхі да кожнага чалавека і стараемся памагчы яму праявіць сябе, раскрыць свае здольнасці. І не толькі ў мастацкай самадзейнасці — гэта было б залішне абмежавана. Менавіта масавыя народныя гулянні даюць прастор ініцыятыве, кемлівасці, спрыту і сіле.

Мне здаецца, што разумнае спалучэнне новых формаў і метадаў культасветработы з няхітрымі, але дасціпнымі вясковымі ўцехамі, якія жылі ў народзе спрадвеку, чуйныя і беражлівыя адносіны да чыста народнай творчасці, фальклору і дае патрэбны, трывалы сплаў. Без гэтага, на маю думку, нельга ўявіць сённяшнюю работу сельскіх клубаў.

Вялікую ўвагу ўдзяляе савет клуба рабоце з моладдзю. Галоўны наш клопат: прывіць моладзі любоў да сваёй вёскі, да свайго калгаса, да роднага краю. Пастаянную прапіску атрымаў у нас урачысты прыём выпускнікоў школы ў сям'ю хлебаробаў.

...Вечар. Групамі і па адным людзі спяшаюцца ў клуб. Пры ўваходзе ў памяшканне старэйшыя калгаснікі сустракаюць герояў дня «хлебам-соллю». Над сцэнай — яркі плакат «Слава рукам, што пахнуць хлебам».

У прэзідыум запрашаюцца члены праўлення, старэйшыя калгаснікі, ветэраны вайны. Ідуць размовы, успаміны, як ствараўся калгас, як адстойвалі завяёвы сацыялізма на франтах Вялікай Айчыннай вайны.

— Юныя нашы сябры, наша змена! Сёння мы прымаем вас у нашу вялікую і дружную сям'ю,— хвалюецца старэйшы калгаснік, былы камандзір партызанскага атрада Мікалай Ігнатавіч Несцераў. — Любіце сваю зямлю. Няма на свеце большага шчасця, чым шчасце мірнай працы на зямлі, вырошчванне хлеба. Будзьце сапраўднымі земляробамі!

Потым юнакі і дзяўчаты даюць клятву на вернасць хлебаробскай прафесіі. Ім павязваюць стужкі «Прыняты ў хлебаробы», уручаюць памятныя падарункі. Пасля гэтага пачынаюцца гульні, танцы. Затым моладзь, прыхапіўшы баян, з песнямі накіроўваецца на «Акулаву гару». Там яны сустракаюць світанне новага дня. З гэтага моманту яны ўжо не вучні, а малодыя хлебаробы, дарослыя людзі, і на іх плечы кладзецца адказнасць за будучыню калгаса.

Некалькі гадоў назад мы прымалі ў калгасную сям'ю Любу Калакольчыкаву. Зараз яна важак нашай камсамоліі, арганізатар гэтых вечароў. Актыўна ўдзельнічаюць у іх і настаўнікі.

Пра настаўніцкі калектыў Каралёўскай васьмігодкі, дружны калектыў энтузіястаў хочацца сказаць асобна.

Чатыры гады назад настаўнікі арганізавалі пры школе «Клуб цікавых сустрэч». Першае пасяджэнне, прысвечанае сустрэчы вучняў і іх бацькоў з юнай партызанкай Айчыннай вайны, бясстрашнай разведчыцай Надзеждай Багданавай.

Колькі цікавых і незабыўных пасяджэнняў клуба адбылося за гэты час! Выступаў у нас Самуіл Ільіч Сінельнікаў, удзельнік Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі, крамлёўскі курсант. Ён неаднаразова бачыў і слухаў У. І. Леніна. Сустракаліся калгаснікі і школьная моладзь з Барысам Кірылавічам Маркіянавым, адным з арганізатараў і кіраўнікоў Обальскага антыфашысцкага падполля, з удзельнікам баёў у Іспаніі лётчыкам Мікалаем Яськіным — былым вучнем нашай школы, Героем Сацыялістычнай Працы, старшынёй калгаса імя Чырвонай Арміі Міхаілам Кацам. Такія сустрэчы вельмі добра памагаюць выхоўваць моладзь на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях народа.

Нягледзячы на занятасць, настаўнікі М. Новікаў, А. Шухоўка, аграном С. Кандратаў, заатэхнік Н. Піменава, эканаміст Л. Альшанікава і іншыя знаходзяць час, каб прачытаць лекцыю, сказаць на рэпетыцыю, прыняць удзел у распрацоўцы сцэнарыя свята. Яны кожны раз з'яўляюцца і членамі журы па правядзенні свят, конкурсаў і спаборніцтваў.

Рыхтуючыся да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна, мы запланавалі шмат разнастайных мерапрыемстваў. У бібліятэцы аформлен ленінскі стэнд, падабрана літаратура аб правадыры. На бліжэйшы час намечана канферэнцыя чытачоў на тэму «Выхаванне дзяцей у сям'і Ульянавых», тэматычны вечар «Вобраз Леніна ў паэзіі, літаратуры і музыцы» і рад іншых масавых мерапрыемстваў.

Спадзяюся, што з дапамогай актыву мы зробім работу нашага клуба яшчэ больш цікавай і змястоўнай.

Віцебскі раён.

РЭСТАЎРАЦЫЯ ВЯЛІКАГА КРАМЛЁЎСКАГА ПАЛАЦА

Са ста з лішнім тысяч савецкіх людзей, якія штодзённа прыязджаюць па сваіх справах у Маскву, з многіх тысяч замежных турыстаў, якія гасцююць у савецкай сталіцы, мала знойдзецца такіх, хто б не захацеў пабываць у Крамлі, пазнаёміцца з яго збудаваннямі. На прыкладзе Крамля няцяжка пераканацца, як многа робіцца ў Савецкім Саюзе для захавання каштоўных помнікаў рускага дойлідства.

У ходзе старанных і разнастайных работ па рэстаўрацыі славутых Крамлёўскіх сабораў вучоныя-гісторыкі зрабілі нямала цікавых адкрыццяў. У радзе выпадкаў архітэктарам удалося пад пластамі больш позніх пераробак і перабудоў выявіць — і пасля аднавіць — першапачатковае аблічча тых або іншых элементаў інтэр'ера.

Толькі што завершана першая чарга работ па рэканструкцыі і рэстаўрацыі Вялікага Крамлёўскага палаца, будынка славутага і шырокавядомага. З трыбуны палаца выступаў Уладзімір Ільіч Ленін. Тут праводзіліся з'езды КПСС, праходзяць сесіі Вярхоўных Саветаў СССР і РСФСР, наладжваюцца ўрачыстыя прыёмы. Паслы замежных краін уручаюць тут свае вярыцельныя граматы.

Вялікі Крамлёўскі палац увенчвае пагорак, дзе восем стагоддзяў таму назад была заснавана Масква. Вялікая грамадзіна велічнага збудавання песціць вока стройнасцю прапорцый, узаемазвязанасцю розных частак. Палац—гэта комплекс збудаванняў розных эпох, пачынаючы з XV стагоддзя. Гранавітая палата, Святыя сені, Царыцына палата, Церамны палац — сведкі сівой даўніны. У 1837—1849 гадах пад кіраўніцтвам архітэктара Тона была ўзведзена новая частка палаца, павернутая да Масква-ракі. У ёй — вестыбюлі, парадная лесвіца, Аванзала, анфілада залаў, прысвечаных рускім ордэнам, царскія апартаменты — так званая «Уласная палавіна», Кацярынінскія залы.

Інтэр'еры палаца пакідаюць вялікае ўражанне. Гэта сапраўдная сімфонія мастацкага майстэрства, творчага натхнення. Выключна прыгожыя гэтыя залы, аздобленыя натуральным або штучным мармурам, шаўковым штофам. Арнаментальная разьба, інкруставаныя бурштынам, чарапахай, металам дзверы, стыльная мэбля, цудоўныя ўзоры прыкладнога майстэрства.

Але гады няўмольна рабілі сваё. Частковыя абнаўленні, зробленыя ў розны час, давалі толькі часовы эфект. Некаторыя нясучыя канструкцыі патрабавалі ўмацавання, а абсталяванне, у першую чаргу, сістэмы асвятлення, вентыляцыі, ацяплення, сантэхнічныя прыстасаванні, — мадэрнізацыі. Шматгранны механізм абслугоўвання дэлегатаў з'ездаў, сесій, сходаў (радыё, узмацненне гуку, тэлебачанне) таксама не адпавядалі сучасным запатрабаванням.

Спатрэбілася рэканструкцыя. Перад архітэктарамі і будаўнікамі былі пастаўлены дзве абавязковыя ўмовы: першая — не парушаць гісторыка-мастацкі вобраз палаца, другая — аднавіць дэталі, пашкоджаныя часам або скажоныя.

Карэспандэнты АДН папрасілі вядомага савецкага знаўцу рэстаўрацыйных работ, кіраўніка майстэрні № 7 інстытута «Маспраект-3» кандыдата архітэктуры Уладзіміра Лібсана расказаць пра абноўленыя залы палаца.

— Шмат месяцаў, цяжкіх і захапляючых, аддаў наш калектыў гэтым гістарычным залам, — сказаў Уладзімір Лібсан. — Мармур сцен параднай лесвіцы, прыступкі і пляцоўкі з даламіту, пазалочаныя рашоткі і стройныя чатырохгранныя калоны—усё памаладзела і заззяла. Праз Аванзалу з камінам з зялёнай яшмы можна трапіць у грандыёзную Георгіеўскую залу. Дойліды мінулага прысвяцілі яе перамогам рускай зброі. Пра маштабы зробленага тут хай скажуць лаканічныя лічбы: на кожны квадратны метр цудоўнага скульптурнага дэкору залы было дадаткова ўстаноўлена 17 мацаванняў з нержавеючага металу, якія змацавалі дэкор са зводам. Усяго спатрэбілася 37 тысяч такіх мацаванняў.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

Гэты здымак зроблены ў Саюзе пісьменнікаў БССР напярэдадні ад'езду ў Маскву, на V Усесаюзную нараду маладых пісьменнікаў, пасланцоў беларускай літаратурнай моладзі. Справа налева — Максім Танк, Іван Мележ, Пімен Панчанка і Іван Шамякін гутараць з удзельнікамі нарады Валянцінам Мысліўцом, Мар'янам Дуксам, Жэняй Янішчыц, Варленам Бечыкам і Анатолем Кудраўцом.

Фота Ул. КРУКА.

Тэатр

СЕМ З СЯМІСОТ

СПЕКТАКЛЬ РЭЦЭНЗУЕ ГЛЯДАЧ

«Усім смярцям назло» па п'есе У. Цітова і К. Міленкі — першая сёлетняя прэм'ера тэатра імя Якуба Коласа. Спектакль пастаўлены маладым рэжысёрам Л. Кавалёвым. Ролю Сяргея Пятрова — героя п'есы — выконвае заслужаны артыст рэспублікі Уладзімір Куляшоў, жонкі Пятрова Тані — маладая актрыса, выпускніца Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута Галіна Бальчэўская.

П'еса напісана па матывах шырока вядомай аповесці, апублікаванай спачатку ў часопісе «Юность», а потым неаднаразова выдадзенай. Аповесць невыпадкова прыцягнула ўвагу тэатра. Прываблівала магчымасць расказаць пра гераізм савецкага чалавека ў мірны час, пра яго высокі маральны дух і пачуццё адказнасці перад часам і самім сабой, пра святое пачуццё таварыскасці. Магчымасць пагаварыць з гледачом, з моладдзю аб самым галоўным — аб месцы ў жыцці, аб каханні, аб стойкасці.

Як жа ўспрынялі спектакль гледачы? Што яны думаюць аб ім?

У зале тэатра—770 месц. Да кожнага гледача не звернешся. Але вось сем водгукаў аб адным спектаклі.

Лена КАНАПЕЛЬКА,
студэнтка:

— Мяне перш-наперш усхвалявала тое, што ў Сяргея Пятрова ёсць прататып у жыцці. Значыць, спектакль — дакумент чалавечага подзвігу. Падзеі прымушаюць больш сур'ёзна і глыбока ўспрымаць і навакольнае жыццё. Глядзіш на тое, што адбываецца на сцэне, і нібы іншымі вачыма, чым звычайна, бачыш і самога сябе, і сяброў.

Мяне вельмі ўсхвалявала жонка Сяргея Пятрова Таня, якую іграе артыстка Г. Бальчэўская. Без гучных слоў, без лішніх фраз, не задумваючыся, яна ідзе на свой подзвіг. Вось сядзіш у зале і ўвесь час думаеш: а ці здолела б і я так? Ці здолела б прапанаваць «свае рукі на дваіх», застацца з інвалідам на ўсё жыццё? Мусіць, не адна я так думаю. Я ўпэўнена, што такія, як Таня,—верныя і чулыя жонкі і сяброўкі — здольныя зрабіць жыццё прыгожым.

Не скажу, што ў спектаклі мне спадабалася рашуча ўсё. Не. Мне здалася залішняй дэманстрацыя паталогіі ў тых месцах, дзе Сяргей Пятроў вучыцца браць кнігі зубамі, разувецца, каб пісаць нагамі. Думаецца, такія сцэны «з жыцця» тэатру супрацьпаказаны.

Мікалай ГРЫЗА,
навучэнец прафтэхвучылішча:

— Я і не ведаю, што сказаць... Сякія-такія думкі, праўда, у мяне ўсё ж ёсць. Вось калі герой п'есы Сяргей кідаўся на правады, якія былі пад напружаннем шэсць тысяч вольт, ён не думаў, што робіць нешта незвычайнае. Як не думаў аб гэтым Аляксандр Матросаў, закрываючы амбразуру дота. Подзвіг для іх — натуральны ўчынак. Але ж мы, гледачы, павінны адчуваць эмацыянальны ўздым чалавека ў рашучы момант жыцця, хочам сустрэцца ў спектаклі з людзьмі страснымі, моцнымі, калі хочаце, незвычайнымі. Па-мойму, такой сустрэчы не адбылося. У зале праліта нямала чуллівых слёз, аднак вынік, мне здаецца, павінен быць іншым. Пасля спектакля людзі павінны станавіцца больш моцнымі, а тут усе «раскіслі».

Калі давядзецца мне стаць акцёрам — а мне вельмі хачацца ім стаць, — буду старацца, каб у глядзельнай зале на такіх спектаклях заўсёды панаваў дух высокіх, мужных пачуццяў.

Шэсць тысяч вольт—высокае напружанне, і вельмі шкада, што мы яго не адчулі.

Іван Казіміравіч БУТНІКАЎ,
падпалкоўнік запасу:

— Глядзеў я сёння спектакль і ўспамінаў вайну. Шмат гора давялося мне пабачыць тады, з многімі людзьмі сустрэцца. Усякія траплялі: добрыя і злыя, смелыя і палахлівыя, моцныя і слабыя... Даводзілася кідаць забітага таварыша і ісці далей, ісці ў бой, каб помсціць фашыстам... Я бачыў слёзы і жах на тварах яшчэ ўчора здаровых і моцных мужчын, якія страцілі рукі, ногі, — здаецца, гэта было самае страшнае. І тады я даў клятву сабе: калі застануся жывы, калі не заб'юць, — усё буду рабіць, каб людзі на зямлі былі шчаслівыя.

Сяргей Пятроў — герой п'есы «Усім смярцям назло» здзяйсняе свой подзвіг у мірны час. Ён мог жыць ціха і шчасліва, разводзіць кветкі, гадаваць дзяцей... А ён у імя жыцця другіх страціў усё гэта ў адно імгненне.

Пра вялікае сэрца Сяргея Пятрова я і хацеў бы дазнацца з гэтага спектакля. Можа, самога Сяргея і не варта было б паказваць так часта ў бездапаможным стане. Гэта і з мастацкага боку не зусім добра атрымліваецца. Але яго ўчынак мог стаць «меркай» для людзей, якія яго акружаюць. Відаць, у сапраўднасці ўсё адбываецца не так проста, як паказана на сцэне. І жонка ў такіх абставінах магла вагацца, хаваючы свой страх за будучае, свае перажыванні, і сябры рэагаваць не аднолькава... А тут брыгада, людзі розныя, а робяць ўсё нібы па загадзя складзенай схеме. Нават чужыя герою людзі паводзяць сябе, як анёлы... Дабро перамагае ў нашым жыцці, але ж не так усё лёгка, як гэта паказвае тэатр.

Сяргей Пятроў у аповесці ўвесь час — на полі бою. На сцэне ён трапляе ў нейкія цяплічныя ўмовы...

Вера МАХОНІНА,
студэнтка:

— Віцебск — мой горад. Тэатр Якуба Коласа—мой тэатр. А пра блізкіх заўсёды цяжэй гаварыць, чым пра чужых, — пра блізкіх гаварыць вельмі адказна. Але пра блізкіх трэба гаварыць толькі праўду, толькі праўду...

Мне спектакль не спадабаўся. Чаму? Раскажу аб усім па парадку. Пачну з п'есы, бо спектакль пачынаецца з п'есы, і ад яе перш за ўсё залежыць усё астатняе. Аповесць «Усім смярцям назло» вельмі хутка стала набыткам мільёнаў людзей. Яе аўтарам Уладзімірам Цітовым, чыё жыццё і подзвіг ляглі ў аснову аповесці, мы захапляемся бясконца.

Але адна справа аповесць, другая — п'еса. Аповесць у інсцэніроўцы, як мне здалося, не толькі страціла непасрэднасць, свежасць вобразаў і мовы, а і ператварылася ў сумную, павучальную дыдактыку, не вельмі прыстасаваную да выканання на сцэне. Уражанне такое, што акцёрам цяжка іграць у п'есе. Нават Куляшову. Я таму гавару «нават», што мне падабаецца гэты артыст. І маім сяброўкам таксама. А тут ён часта пазіруе... Нейкімі недарэчнымі выглядаюць усе сцэны, дзе Сяргея заклікаюць стаць пісьменнікам, быццам пісьменнікам можна зрабіцца па закліку! Пятроў напісаны адной фарбай. Дарэчы, і астатнія — таксама аднапланавыя.

Можа, я і не зусім справядліва гавару, ды што ж паробіш, калі многія вобразы п'есы выглядаюць шаблоннымі. Гэта і незнаёмы чалавек, які аддае сваю кроў, і маладая жанчына, якая часта мяняе колер валос, а вось з мужам не сышлася характарам, і сентыментальная медсястра, і традыцыйная нянечка, і ўсемагутны ўрач з вобласці.

Мне не падабаецца глыбакадумная шматзначнасць, якая надаецца звычайным, усім зразумелым фразам. Ну, такім, напрыклад: «Чалавек нараджаецца, каб жыць...» Так, чалавек нараджаецца, каб жыць, і гэтую ісціну не трэба так узнёсла тлумачыць са сцэны. Асабіста мяне гэта нават злуе...

Ну, што яшчэ мне хацелася б сказаць? Мне здалося, што рытм спектакля нейкі млявы, што спектакль пакуль яшчэ не знайшоў свайго рэчышча, каб паліцца лёгка і натуральна.

Закончыць я хачу тымі ж словамі, якімі і пачала: тэатр Якуба Коласа — мой тэатр і яго няўдачы я перажываю, як свае асабістыя. Але я веру, што наперадзе мяне чакае шмат новых, цікавых і значных спектакляў.

Галя КАБЗЕВА і Люда ШУР,
госці Віцебска:

Галя. Я стаўлюся да спектакля стрымана, трэба яшчэ падумаць...

Люда. А мне спадабаўся.

Галя. Ну што, што табе спадабалася?

Люда. Усё. Людзі моцныя. Пастаўлены спектакль цікава. Акцёры прыгожыя.

Галя. Ды тое, што людзі моцныя, — гэта ж у спектаклі толькі дэкларуецца... І дэкерацыі...

Люда. Добрыя!

Галя. Добрыя, добрыя... А мне не зразумела, навошта трохкутны экран вісіць.

Люда. Ну, вісіць і вісіць. Не разумееш — месца дзеяння на ім абазначаецца.

Галя. Чаму ж тады раптам на гэтым жа экране думкі Сяргея Пятрова ўзнікаюць?..

Люда. Хай узнікаюць! Мне гэта не перашкаджала. А табе не захацелася быць падобнай на Таню, жонку Сяргея? Ну, скажы?

Галя. Трэба будзе, можа і стану падобнай.

Люда. Бачыш — значыць, і цябе пранялo!..

Галя. Праняло? Трэба падумаць...

Анна Сямёнаўна БЯЛЯВІНА,
пенсіянерка:

— У тэатры я бываю не так ужо часта, і таму, прабачце, калі скажу што-небудзь не так.

Вось вы пытаецеся, чаму я плачу. А мне хочацца ў вас спытацца, як вы можаце вытрымаць і не плакаць? Няўжо вам не шкада Сяргожы Пятрова? Гэта ж страшна сабе ўявіць, што значыць на ўсё жыццё калекай застацца. Я гляджу спектакль, а сама пра другое думаю. Калі хочаце, раскажу — пра што. Ёсць у майго сына сябра — Лёня Рашкоўскі. Разам вучыліся. І вось Лёня неяк сарваўся з турніка і зламаў пазваночнік. Быў ён звычайным хлопцам, якіх многа, а вось прыйшло нясчасце — ён ужо дзесяць год прыкуты да ложка. І — стаў героем. Мне здаецца, што стаў... Адкуль толькі сілы ўзяліся, але пачаў ён пісаць. Жыве ён цяпер у Барысаве. Нядаўна пачула я па радыё, што выйшла ў яго кніжка вершаў. Шкада толькі, што дастаць ніяк не магу...

І пра гэта я думала, калі глядзела спектакль. Спадабаўся ён мне ці не спадабаўся — відаць, не гэта самае галоўнае. Але пра такіх хлопцаў усім расказваць трэба. Хаця плакаць не варта, бо ў жалю такія людзі не маюць патрэбы: яны—моцныя...

Сем водгукаў з сямісот — зразумела, яны не могуць быць усеабдымнымі, але нам здаецца, што ў іх ёсць тое рацыянальнае зерне, якое можа быць карысным і цікавым для тэатра.

Рэцэнзіі запісала
І. ПІСЬМЕННАЯ.



У ГОМЕЛЬСКІМ абласным драматычным тэатры адбылася прэм'ера па п'есе С. Алёшына «Другая». Рэжысёр А. Герэнбург, мастак М. Гафт, музычнае афармленне Г. Гофмана.

У спектаклі заняты заслужаныя артысты рэспублікі Л. Сторажава, А. Каменская, А. Каменскі, артысты П. Вараб'ў, Э. Цурбакоў, З. Казанцава, В. Аўдзеева, А. Валодзіна і Г. Макоўская.

На здымку вы бачыце Л. Сторажаву ў ролі Кацярыны Васільеўны і А. Каменскага ў ролі Барыса Васільевіча.

Фота П. ФІЛІПАВА.

СКЛАДАНАСЦЬ? НЕ — МАНЕРНАСЦЬ!

ПА ВЫСТАВАЧНЫХ ЗАЛАХ

— ТЫ БАЧЫЎ ужо выстаўку маладых мастакоў? — гэта пытанне я задаў добраму дзесятку сваіх знаёмых, людзей, якія сур'ёзна цікавяцца мастацтвам.

Яны шчыра здзіўляліся:

— А дзе яна адкрылася?

Спачатку іх рэакцыя крыху смяшыла, пасля здзіўляла — хацелася разабрацца, што ж такое здарылася. Чаму вось ужо больш за тыдзень вісіць у памяшканні Саюза мастакоў выстаўка маладых, і амаль ніхто пра яе не гаворыць, не спрачаецца, нават не ведае. Можа таму, што выстаўка не для шырокага кола гледачоў, адкрыта ў нязвыклым памяшканні і не мае ніякай рэкламы? Так, і гэта таксама прычына, але ж мы памятаем выпадкі, калі і на такіх выстаўках было поўна наведвальнікаў. Людзі выказвалі свае думкі, некага абаранялі, з некім не згаджаліся. І гэта было натуральна, бо на тое ж, напэўна, і існуюць выстаўкі маладых, каб непакоіць розум юнацкім напалам, смеласцю, можа не заўсёды апраўданай, але прывабнай, бо ідзе яна ад упэўненасці ў сваіх сілах, чысціні і высокага ўзлёту пачуццяў. Такія выстаўкі даволі часта былі для маладых мастакоў пуцёўкай у вялікае мастацтва, першым крокам да прызнання.

Я разы са тры прыходзіў на выстаўку — усё спадзяваўся, можа няўдала выбраў час, можа вось зараз сюды хлыне натоўп моладзі, студэнтаў.

Дарэмна. У залах выстаўкі не збіралася адначасова больш чатырох чалавек.

Няўдача.

Правал.

І галоўная прычына гэтай няўдачы здаецца мне ў тым, што выстаўка проста не цікавая, сумная. Амаль усе недахопы нашай творчай моладзі выявіліся тут на дзіва відавочна — і няўменне па-філасофску абагульніць падзеі часу, і беднасць мастацкай мовы, і дрэннае валоданне малюнкам. Нават агню, маладой дзёрзкасці, непасрэднасці і то нельга было заўважыць у работах маладых жывапісцаў, графікаў, скульптараў.

І няма на выстаўцы работ, якія б вырашалі альбо проста намагаліся вырашыць буйныя, хвалюючыя пытанні, якія б даказвалі, што маладыя мастакі актыўна ўдзельнічаюць у агульным грамадскім жыцці. Амаль усё неабавязковае, дробнае, прэтэнцыёзнае ці яўна бездапаможнае.

Удзельнікаў выстаўкі, напэўна, можна падзяліць на некалькі груп. У адну сабраліся мастакі, што прадэманстравалі сваю поўную творчую непадрыхтаванасць. З гэтай групай усё больш-менш проста. Па-першае, яна не надта вялікая, па-другое, кожны наведвальнік сам даволі лёгка здолее вызначыць яе межы, так што і імёнаў, напэўна, называць не трэба...

Больш складана з другой групай, дзе ёсць мастакі, якіх не назавеш дрэннымі выканаўцамі, якія маюць некаторы вопыт, здольнасці, ды і ўрэшце адпаведную адукацыю... На першы погляд, здаецца што гэтыя мастакі стараюцца падысці да тэмы з нейкага вельмі нечаканага боку, сказаць нешта такое, што нідзе і ніколі не было яшчэ сказана. Але потым пачынаем разумець, што гэта фальсіфікацыя, разлічаная на прастакоў, бо за ўяўнай шматзначнасцю — пустата.

Возьмем для прыкладу дзве работы маладых мастакоў В. Матросава і І. Серады — «Будоўля» і «Завод». Возьмем іх таму, што яны амаль аб адным і тым жа, вырашаны ў аднолькава абагульненай манеры і яшчэ таму, што на іх прыкладзе найбольш яскрава відаць, да чаго прыводзіць у мастацтве павярхоўнасць і «ўсяднасць».

Чалавек і вытворчасць. Чалавек і машына. Чалавек і прагрэс. Вось тэматыка гэтых работ. Натуральна, што нам вельмі цікава прасачыць за ходам думкі, развіццём пачуццяў нашага сучасніка, маладога мастака. Нам вельмі цікава даведацца аб яго стаўленні да гэтай, напэўна, адной з самых балючых праблем нашага часу. Мы чакаем арыгінальных думак, глыбокіх пачуццяў, можа нават споведзі. Але ўзамен гэтага нам прапануецца...

Чалавек згубіўся сярод канструкцый нейкай велізарнай будоўлі, сярод неверагоднага жахлівага перапляцення труб, правадоў, камунікацый завода. Ён пазбаўлены аблічча, заціснуты і прыгнечаны шэрым колерам. Ды і сам ён, чалавек, згубіўшы звычныя абрысы свайго цела, ператварыўся ў шэрую, без інтэлекту і без пачуццяў машыну, у робата.

Ці трэба абвяргаць гэтую канцэпцыю? Здаецца, не. Па-першае, таму, што яна ўжо не аднойчы і грунтоўна абвергнута. Па-другое, таму, што, упэўнены, ні для Матросава, ні для Серады яна не з'яўляецца вынікам жыццёвых назіранняў, супастаўленняў, аналізу. Прываблівае іх у выбранай тэме знешняя выйгрышнасць, магчымасць «бліснуць» арыгінальнасцю. І яны не заўважылі, што бляск фальшывы, а за ўяўнай арыгінальнасцю — простая банальшчына...

Многія работы на выстаўцы грашаць гэтай уяўнай шматзначнасцю, манернасцю, нейкімі намёкамі на падтэкст у тых месцах, дзе ніякага падтэксту няма. Складаецца такое ўражанне, што маладыя мастакі робяць усё, каб толькі пра іх падумалі, што яны не такія простыя, што ў іх складанае мысленне, багатыя асацыяцыі.

Зразумела, ёсць на выстаўцы і работы, якія заслугоўваюць вышэйшай ацэнкі. Першнаперш, я маю на ўвазе работы З. Літвінавай «Партрэт», «Поўдзень», «Сябры», нацюрморты С. Катковай «Персікі», «Бананы», трыпціх В. Раманава і два партрэты В. Новака. Гэтыя работы выдзяляюцца сярод астатняй экспазіцыі сваёй прадуманасцю, дакладнасцю выканання, цеплынёй. Маладыя мастакі сапраўды здолелі перадаць свае думкі, здолелі пераканаць нас у тым, у што вераць самі. Гэтыя работы вызначаюцца сярод іншых культурай жывапісу, сапраўдным мастакоўскім умельствам.

Асаблівую ўвагу хацелася б звярнуць на два нацюрморты С. Катковай. Нацюрморт — вельмі складаны жанр. Амаль заўсёды ў ім праяўляюцца ўсе моцныя і слабыя бакі жывапісца. Па нацюрморце можна даведацца аб тым, у якіх узаемаадносінах знаходзіцца мастак з кампазіцыяй, з каларытам. Добры нацюрморт можа шмат чаго расказаць нам і пра свайго аўтара, пра яго ўнутраны свет.

Нацюрморты С. Катковай вельмі нечаканыя ў колеравым вырашэнні, але гэтая нечаканасць не выклікае спрэчак, яна апраўдана. Мы адчуваем у стрыманых, мяккіх па каларыце карцінах вялікую зацікаўленасць аўтара, яе ўмельства пранікнуць у заканамернасці колеравых спалучэнняў.

Але ўдалыя работы на выстаўцы — рэдкія. Увогуле ж выстаўка атрымалася не цікавай і не прадстаўнічай. Справа, напэўна, у тым, што многія маладыя мастакі, удзельнікі гэтай выстаўкі, яшчэ не прайшлі перыяду «мутацыі голасу». Ён у іх то зрываецца на дзіцячы дыскант, то нечакана і недарэчна бухае актавай. Але ж калі спявак альбо акцёр перажывае такі перыяд, яго шкадуюць і не дазваляюць выступаць перад публікай.

Можа, мела б сэнс і для саміх мастакоў і для прэстыжу такіх выставак у будучым больш крытычна падыходзіць да работ, якія адбіраліся для экспазіцыі? Зразумела, усім маладым мастакам хацелася паказаць, на што яны годныя. Але ж бываюць такія выпадкі, калі педагог альбо проста больш вопытны таварыш павінен утрымаць маладога чалавека ад гэтага неабдуманага ўчынку...

А. БЕЛАВУСАЎ.

ЗАЛАТЫЯ РУКІ ЎМЕЛЬЦА

Убогая сялянская хатка пад саламянай страхой. Калодзеж з традыцыйным журавом, прасніца, посуд і іншыя прадметы няхітрага сялянскага побыту. Да ніцай бярозы прытуліліся дзеці. А ўдалечыні — пара валоў і араты.

Гэтую карцінку з далёкага мінулага беларускай вёскі аднавілі на макеце народныя ўмельцы са Слоніма муж і жонка Жыткевічы. Іх работы з поспехам экспанаваліся на раённай, абласной і рэспубліканскай выстаўках народнай творчасці.

Івана Захаравіча Жыткевіча на Слонімшчыне называюць «Ляўшой» — помніцца знакаміты ляскоўскі герой! Многія яго мініяцюрныя сувеніры захоўваюцца ў Маскоўскіх музеях. Сярод іх — унікальны замок велічынёй з ільняное зерне, чаканка па металу. Адзін з сувеніраў народнага ўмельца — пянёк з мініяцюрнай сякеркай — быў прадстаўлены на Міжнароднай выстаўцы ў Манрэалі.

Цяпер Жыткевічы робяць новыя сувеніры па матывах нацыянальнай беларускай творчасці.

М. РЫЛКО.

ЭКСПАНАТЫ МУЖНАСЦІ

У Пінскім краязнаўчым музеі пасля рэканструкцыі адкрылася зала Вялікай Айчыннай вайны. Тут выстаўлена больш як 500 экспанатаў, прычым палова з іх экспануецца ўпершыню. Яны расказваюць аб гераічным подзвігу маракоў Дняпроўскай флатыліі ў першыя дні 1941 года, аб баях за вызваленне горада на Піне ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, патрыятычным падполлі, аб земляках, якія змагаліся супраць ворага на тэрыторыі краін Заходняй Еўропы, і аб зарубежных сябрах, што дзейнічалі ў партызанскіх атрадах беларускага Палесся.

І. РУСАКОЎ.

НАВАСЕЛЛЕ МУЗЫЧНАЙ

Новы двухпавярховы будынак другой музычнай школы вырас у цэнтры індустрыяльнай Маркаўшчыны — былой ускраіны Віцебска. Архітэктары і будаўнікі зрабілі ўсё для паспяховай вучобы будучых музыкантаў. Утульныя, светлыя класы, добрая акустыка. На другім паверсе — прасторная актавая зала з кінаўстаноўкай для дэманстрацыі вучэбных фільмаў, нотная бібліятэка.

Цяпер на Віцебшчыне працуе 31 музычная навучальная ўстанова.

А. АРЦЕМАЎ.

Не так даўно танцавальны калектыў Пінскага гарадскога Дома культуры ператвораны ў самадзейны ансамбль танца «Палессе». Зараз у ім удзельнічае каля 40 заўзятых аматараў харэаграфічнага мастацтва. Пад кіраўніцтвам бале майстра Вінтара Ліса створана новая праграма. У ёй—«Палескі маладзёжны танец», беларускі народны танец «Прымакі», «Пінскі вальс» і г. д. Хутка з новай праграмай ансамбль будзе выступаць у сельскіх дамах культуры Брэсцкай вобласці.

На здымку — выконваецца «Палескі маладзёжны танец».

Фота М. МІНКОВІЧА.

ВОДГУКІ, АДКАЗЫ

ПАСЛЯ ЗЛАЧЫНСТВА

Некалькі месяцаў назад мінчан уразіла вестка аб жудасным злачынстве трох падлеткаў з Мар'інай горкі. Узяўшы ў Мінску таксі, яны папрасілі шафёра адвезці іх за горад і па дарозе забілі яго. Аб тым, як сталі непаўналетнія Г. Каранеўскі, В. Сіманенкаў і С. Уржэнка на шлях злачынстваў, аб уроках, якія павінны зрабіць для сябе работнікі міліцыі, педагогі, грамадскасць, пісалася ў артыкуле М. Замскага «Справа № 01754», змешчаным у газеце «Літаратура і мастацтва» 25 лютага г. г.

З поваду гэтага артыкула ў рэдакцыю паступіла некалькі пісьмаў.

У пісьме з Упраўлення ўнутраных спраў выканкома Мінскага абласнога савета дэпутатаў працоўных гаворыцца:

«Паведамляем, што факты, прыведзеныя ў артыкуле «Справа № 01754», намі праверены. Прыняты адпаведныя меры, каб актывізаваць папераджальна-прафілактычную работу сярод непаўналетніх у горадзе Мар'іна горка і Мінскай вобласці.

Артыкул абмеркаваны на адкрытым партыйным сходзе аддзела ўнутраных спраў Пухавіцкага райвыканкома. Прынята рашэнне палепшыць работу сярод непаўналетніх і моладзі ў Пухавіцкім раёне.

12 сакавіка 1969 года на пасяджэнні калегіі Упраўлення ўнутраных спраў Мінаблвыканкома спецыяльна разгледжана пытанне «Аб фактах злачынстваў на тэрыторыі Пухавіцкага раёна Мінскай вобласці групы непаўналетніх Каранеўскага Г. В., Сіманенкава В. В. і Уржэнка С. П.».

За памылкі ў рабоце па папярэджванні злачынстваў і парушэнняў законнасці непаўналетнімі ў раёне на начальніка аддзела ўнутраных спраў Пухавіцкага райвыканкома падпалкоўніка міліцыі Вардамскага М. Ф. і начальніка крымінальнага вышуку гэтага ж аддзела маёра міліцыі Шкатула А. У. накладзена адміністрацыйнае спагнанне. Калегія Упраўлення ўнутраных спраў запатрабавала ад іх прыняць меры, каб палепшыць папярэджвальна-прафілактычную работу з непаўналетнімі і моладдзю».

Начальнік аддзела ўнутраных спраў Пухавіцкага райвыканкома падпалкоўнік міліцыі М. Вардамскі таксама паведаміў у рэдакцыю, што артыкул «Справа № 01754» абмяркоўвалася на адкрытым партыйным сходзе супрацоўнікаў аддзела. Крытыка ў адрас аддзела ўнутраных спраў прызнана правільнай. Намечаны меры па выпраўленні недахопаў у прафілактычнай рабоце сярод моладзі.

Дырэктар Мінскай школы № 35 С. Міронаў пацвердзіў, што лабарант школы Н. Прыгажаеў сапраўды пры дзецях страляў з пнеўматычнай вінтоўкі па галубах, як пра гэта расказвалася ў артыкуле. Але ганебны гэты ўчынак быў зроблены Прыгажаевым самавольна, а не па загадзе дырэктара. За недахопы ў рабоце і адмоўны ўплыў на школьнікаў, Прыгажаеву абвешчана вымова.

З поштаў ЛіМа

ПАВІСЛІ Ў ПАВЕТРЫ

Спачатку некалькі лічбаў. Зараз у нашай рэспубліцы 8 400 кінаўстановак, з іх 5 400 — у дзяржаўнай сістэме кінафікацыі. У сярэднім кожны год кінасетка пашыраецца на трыста ўстановак.

Кадры кінамеханікаў рыхтуюць Мінскае, Астрынскае (Гродзенская вобласць) і Добрушскае прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча. Агульная «прадукцыйнасць» іх немалая — сёлета, напрыклад, яны павінны выпусціць тысячу маладых спецыялістаў. Акрамя таго, многія кінатэатры рыхтуюць кінамеханікаў самі (атэстуюць іх абласныя і Мінскае гарадское ўпраўленні кінафікацыі).

Здаецца, вось-вось настане такі час, калі кінамеханікаў ужо будзе дастаткова. Але гэта далёка не так. Кінасетка рэспублікі не першы год адчувае голад на кадры. Вось і сёлета ў студзені ў адным толькі Талачынскім раёне з-за недахопу кінамеханікаў на дзесяці кінаўстаноўках працавалі людзі без кваліфікацыйных пасведчанняў.

У іншых раёнах становішча яшчэ больш складанае.

З таго часу, як прафтэхвучылішчы кінамеханікаў былі перададзены сістэме прафтэхадукацыі, Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі абмяжоўваецца толькі тым, што пасылае ва ўпраўленні кінафікацыі паперкі — каму і колькі кандыдатаў у вучылішча падабраць—і потым не цікавіцца, як выконваюцца яго «разнарадкі».

Спашлюся на прыклады. Летась Віцебскае абласное ўпраўленне кінафікацыі замест 120 чалавек накіравала ў Мінскае вучылішча толькі 30. Больш уважліва паставілася да справы Мінскае абласное ўпраўленне, але і яно прыслала 125 чалавек замест 190. Сёлета ж камітэт не праявіў аб вучылішчах нават такіх мізэрных клопатаў.

Каб набраць кантынгент навучэнцаў, наша вучылішча з году ў год вымушана прымаць абы каго і абы адкуль. І што атрымліваецца? У 1968 годзе вучылішча закончыла 98 мінчан — у два разы больш, чым патрабавалася для горада. Зразумела, усе гэтыя спецыялісты ўладкаваны на работу па спецыяльнасці не змаглі.

Не сочаць органы кінафікацыі і за тым, ці прыбываюць на месца людзі, якіх накіроўвалі на вучобу з раёнаў. У выніку многія выпускнікі застаюцца ў Мінску ці Мінскім раёне.

Адмежаваўшыся ад вучылішчаў, Камітэт па кінематаграфіі ў той жа час усяляк насаджае вучнёўства ў кінатэатрах. Для атэстацыі навучаных «упрыглядку» кінамеханікаў у кожнай вобласці пры ўпраўленнях кінафікацыі існуюць кваліфікацыйныя камісіі. На мой погляд, іх трэба пакінуць толькі ў тых абласцях, дзе ёсць вучылішчы — у Мінску, Гомелі, Гродна. Ад навучання механікаў пры кінатэатрах варта зусім адмовіцца.

Спецыяльнасць кінамеханіка складаная. Трэба многа ўмець, многа ведаць. На сяле кінамеханік з памочнікам з'яўляюцца і касірамі, і кантралёрамі, яны ж адказваюць за выкананне плана, культуру абслугоўвання, захаванасць кінаапаратуры і фільмакопій, за супрацьпажарную бяспеку. Але праграмы праверкі ведаў, складзеныя кваліфікацыйнымі камісіямі ўпраўленняў, не ахопліваюць усіх тых прадметаў, якія выкладаюцца ў вучылішчы, і кваліфікацыя кінамеханікаў далёка не роўная. Тым не менш пасведчанні камісіі выдаюць абсалютна такія ж, як і вучылішчы, і гэтыя пасведчанні забяспечваюць роўныя правы, роўную зарплату.

Шмат што можна было б паправіць, калі б склікаліся спецыяльныя нарады інжынерна-тэхнічных работнікаў кінасеткі і работнікаў вучылішчаў, калі б Дзяржаўны камітэт Савета Міністраў БССР па прафтэхадукацыі і Дзяржаўны камітэт па кінематаграфіі больш мелі паміж сабою кантактаў.

Хацелася б спыніцца і на некаторых іншых пытаннях.

У Мінскім гарадскім прафесіянальна-тэхнічным вучылішчы кінамеханікаў № 40 за апошні час адбылося нямала прыемных змен. Пабудаваны лабараторыі слясарства, кінаэлектрастанцый і стацыянарнай кінаапаратуры, узводзяцца яшчэ лабараторыі і інтэрнат на 300 месц. Многія лабараторыі папоўнены новым абсталяваннем.

Усё гэта добра, усё гэта дае магчымасць павысіць якасць навучання.

Але патрабуе ўдасканалення і сістэма вытворчай практыкі навучэнцаў. Зараз навучэнцы практыкуюцца ў асноўным у тых месцах, адкуль іх накіроўвалі на вучобу, і кіраўнікі кінасеткі могуць прыглядзецца да іх, пазнаёміцца, вызначыць іх месца будучай работы. Бывае, аднак, што практыканты працуюць у такіх далёкіх сёлах, што іх практыкай, па сутнасці, ніхто не можа кіраваць. Нам думаецца, што практыку трэба арганізоўваць і на сяле, і ў гарадскіх кінатэатрах. А яшчэ лепш, каб у гарадскіх кінатэатрах усе месцы вучняў і памочнікаў былі перададзены нашым практыкантам.

У арганізацыі вучэбнага працэсу ў вучылішчах таксама многа нявырашаных пытанняў. На маю думку, няма патрэбы выкладаць курс «Кінаэлектрастанцыі» — у рэспубліцы ўжо ўсе вёскі электрыфікаваны. Таму адведзены для гэтага курса час лепш аддаць на вывучэнне электразабеспячэння і мантажу кінаўстановак, кінапраекцыйнай тэхнікі.

Нашым вучылішчам патрэбны вучэбныя фільмы. Іх магла б зрабіць для нас кінастудыя «Беларусьфільм». А мінскі завод імя Вавілава мог бы вырабіць спецыяльную апаратуру для дэманстрацыі вучэбных фільмаў на 16-міліметровай плёнцы, каб можна было прыпыняць стужку на любым кадры. Вельмі патрэбны нам і разнастайныя вучэбныя плакаты. Мы робім іх самі, уручную, прымітыўна, і на гэта ідзе шмат часу. Між тым усе гэтыя схемы і плакаты можна выпусціць паліграфічным спосабам, цэнтралізавана.

Калі гэтыя пытанні будуць вырашаны, вучылішча зможа не толькі рыхтаваць паўнацэнныя кадры, але і перападрыхтоўваць тых кінамеханікаў і работнікаў кінафікацыі і кінапракату, чые веды ўжо застарэлі. Такія курсы перападрыхтоўкі час ад часу арганізоўваюцца Дзяржаўным камітэтам па кінематаграфіі, але... па-за вучылішчам, без выкарыстання нашай багатай вытворчай базы. Так рашуча адмяжоўваецца ад нас, я думаю, не варта. Інтарэсы ж у нас агульныя.

Э. КРАСОЎСКІ,
выкладчык Мінскага ГПТВ-40 кінамеханікаў, няштатны інспектар Камітэта народнага кантролю БССР.

Сувеніры і вышыўкі Чачэрскай фабрыкі ўжо не раз перасякалі акіян. Яны пабывалі на шматлікіх міжнародных выстаўках. У Манрэалі на «ЭКСПО-67» вырабы чачэрскіх майстроў карысталіся вялікай папулярнасцю ў наведвальнікаў павільёна СССР.

Зараз фабрыка пачала падрыхтоўку да Сусветнай выстаўкі, якая адбудзецца ў японскім горадзе Асака.

На здымку вы бачыце мастака фабрыкі Марыю Мацвееву (злева) і тэхнолага Іну Крайко. Яны адбіраюць узоры для выстаўкі ў Японіі.

Фота Ул. МЯЖЭВІЧА.

Паэтычная паверка

Васіль ЗУЕНАК

З ВЫСТАЎКІ

І. КОЛЕР

Шлях чырвоны не ружамі усыпан
Чырвонымі.
Ён блакітны, дзе вораг
кулямі сыкаў
Шалёнымі.
Ад удовіных слёз
і ад слёз мацярынскіх,
Што над ложкам халодным,
над цёплай калыскай
Праліты—
Блакітны.
Ён свінцовы, як вочы,
Што ў нашыя душы
калісьці
Глядзелі.
Ён зялёны,
як першае лісце
Надзеі.
Чорны ён. Да белага бляску —
Чорны.
Гэта — твары і каскі
Шахцёраў.
Ён ад цэглы і пылу
І ад сонца —
руды.
Крокі нашае сілы —
Гарады,
гарады...
Ён...
. . . .
—Спыні паток летуценняў!
Дзе ты знойдзеш
такія адценні!
— Я!
Прабач, дарагі мастак...
Я — падумаў.
Я проста так...

2. ПАРТРЭТ

Ты з'явілася так нечакана
У мітусні развітанняў трывожных.
Лёг спакойна профіль чаканы
На акне казённа-дарожным.
Гаварыла нязначныя словы.
Толькі вочы былі, як малітва:
Не туды, не туды нясло нас
Злое буйства жалезных рытмаў...
Я прыпынак дакладна ведаў:
Ён у той далёкай краіне,
Дзе па росах адна непаседа
У пушчу бегала вусны малініць;
Дзе другі —
гусіным прэм'ерам —
Цёгся ў поле з цёплай пасцелі;
Дзе сустрэцца, па нейкіх намерах,
Сцежкі нашы не захацелі...
Ты з'явілася так нечакана.
І так позна...
«Мой дзень вясновы, —
Ты сказала, — даўно адспяваны.
Засталіся асеннія словы...»

3. ВАРАЖБА НА ВАДЗЕ

ГРАВЮРА

Лясное возера. Маўклівасць.
Далёка!
Блізка
да бяды!
Як дзве загадкі ўсцяж вады —
Бы ў лютым ад канькоў імклівых—
Два рэактыўныя сляды.

ТЫ ПАЙШОЎ

Памяці бацькі.

А восень пяцьдзесят чацвёртага
Забірала апошні вырай:
Адлятаў ён —
Навекі.
Суседзі рупна кідалі
Зярнят залатую надзею,
І рунню зялёнай яна
засталася —
Навекі.
Вечар восьмага лістапада
Пагрукаў у сэрца:
— Збірайся! —
Апошні твой вечар —
Навекі.
Ты пайшоў...
І дарогу табе
Усцілаў снег бялюткі
І першы —
Навекі.

ВЯСНЯНКА

Для выпаса прастору шмат:
Гані Пегаса-клячу,
Стол — запапераны варштат —
Пакінь,
забудзь няўдачы,
«Стругаць» вучыся песні так,
Каб без варштата,
як мастак—
Той, шэранькі, над Начай...

Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА

■ ■ ■

На даліне
Пахне сена.
На далоні
Маці-мачыхі
Сонца села.
Светла-русы месячык той
Марудна п'е сырадой.
Над конаўкай белыя вусы.
Ячмень натапырыў вушы.
— О-о-о-о-х!
Баравік прапупіў мох.
Прыхапіўшы ў руку мурыжынку,
Жанчына гоніць сцяжынку, —
Вяртаецца перад ноччу
У вулей пчала з медазбору.
Грамы, як каты, вуркочуць
На вуха бору.
Плешчуцца поўныя рэкі —
Светлых надзей арэлі.

■ ■ ■

Загарэлай,
Спрацаванай, босай,
Тут мне думаецца найчысцей,
Дзе драздзы-падлёткі у пракосы
Шыюцца ад крыксуноў-дзяцей,
Дзе, збудзіўшы сонца, на дасвецці
Промні ў Нёмане рагулі п'юць,
Дзе жанчыны, як малыя дзеці,
Адначасна плачуць і пяюць.

Жэня ЯНІШЧЫЦ

■ ■ ■

Я дзякую за тое, што было.
Не трэба хвалявацца і журыцца.
Цябе залётным ветрам аднясло
І вір маіх вачэй не праясніцца.

Не трэба ў апраўданне важкіх
слоў.
Ты можаш заўтра шумна
весяліцца.
Я дзякую за тое, што прайшло
І што не можа болей паўтарыцца.

Сяргей ПАНІЗНІК

■ ■ ■

Вясна! Так блізка тваё неба,
І пахне воблака, як бохан хлеба.
Разбегся над лясамі гром,
Махнуў сваім цяжкім крылом.
А неба развінаецца, шырэе,
Разламваецца і ад хмар шарэе.
Штурхае навальніца свой паром.
Вясенні гром! Вясенні першы гром!
Дажджом спагадным
вызначаны след:
— Ідзі, вясна, ў зялёна-сіні свет!

Пра першую кніжку пісьменніка

ЧЫМ ЖЫЛІ І ЖЫВУЦЬ АДНАГОДКІ

У ПЕРШАЙ кнізе Міколы Капыловіча «Скрозь жывуць людзі» ёсць некалькі апавяданняў пра дзяцінства, на долю якога выпала перажыць жудасныя жахі вайны, зведаць сіроцтва і нішчымніцу і рана ўзяць на плечы цяжар заўчаснага пасталення. Гэта — нялёгкія, суровыя старонкі жыцця вельмі многіх з нас, равеснікаў аўтара. Пісалася пра гэта шмат. Мікола Капыловіч надрукаваў свае апавяданні «Сірата», «У ружовым тумане», «Птушыны бацька», «Па хлеб» пасля таго, як мы ўжо зноў неаднойчы востра перажывалі сваё дзяцінства, чытаючы творы І. Пташнікава і М. Стральцова, І. Чыгрынава і Б. Сачанкі і многіх іншых пісьменнікаў.

Расказаць новыя падрабязнасці, даць яшчэ некалькі ўспамінаў-эпізодаў дзяцінства, няхай сабе нават яркіх і выразных, — сёння ўжо мала. Каб пазбегнуць паўтарэння, вар'іравання шмат у чым падобных жыццёвых гісторый, патрэбны новая псіхалагічная глыбіня, жыццёва і літаратурна новае, вельмі асабістае асэнсаванне гэтых самых успамінаў, што не пакідаюць і ніколі не пакінуць нашай памяці.

Ці ўдалося М. Капыловічу сказаць у сваіх апавяданнях гэта новае, сваё, ці не паўтарае ён сваіх папярэднікаў?

Мне думаецца, многія з хваляваннем прачытаюць апавяданне «Сірата». Яно зусім кароценькае — адна сцэнка, невялікі эпізод. «У алешніку над рэчкай, дзе трохі паднялася атава, Антося вучыла сына касіць, бо праходзіць лета, а ў трысцёне была хіба адна толькі ношка сена — ці ж багата выжнеш сярпом...» Хлапчук-бязбацькавіч вучыцца касіць, але «каса адскоквала ад травы, не хацела яе браць» — хлопцу была не па сіле гэтая навука. І ўсё ж ён зацята дзяўбе траву. А побач лёгка гоніць пракос сусед, дзядзька Цімох. Намагаецца абыякавасцю і нават злосцю адпіхвацца ад чужога гора, але ў вачах яго ўсё стаіць «гэты Юзікаў хлопец з сінім тварам, з анучаю на назе, з іржаваю касою на плячы...» І нарэшце Цімох усё ж дапамагае хлапчуку, і вось ужо той пачынае касіць спрытней, хоць, пэўна, і не так спрытна, як гэта ўяўляецца маці: «Маці бачыла, як у руках сына лоўка і спрытна шоргала мянташка, як ён, прутка расставіўшы ногі, пайшоў за касою, валіў у разору зелле, і ўсярэдзіне яе заныла, і свет засланілі слёзы...»

І ўсё. Зусім мала і вельмі многа. Аўтарскае перажыванне мнагаслойнае: ёсць у ім боль і пяшчота, ёсць разуменне няпростага ў суровым пасляваенным жыцці, прабуджэння душэўнай спагады ў староннім чалавеку — Цімоху, ёсць скупа, але шчымліва выказанае спачуванне гэтаму сірочаму дзяцінству — з матчынымі слязьмі, з уласнай бездапаможнасцю, з трудным недзіцячым клопатам аб сям'і, гаспадарцы. І ўсё апавяданне — як горкі наклон памяці таму дзяцінству, што сёння згадваецца так востра і балюча. І гэты настрой сцягвае, збірае да аднаго пачуцця думкі, ледзь не кожную падрабязнасць.

Апавяданне было б на шмат бяднейшае без матчынай ласкавай прыгаворкі, якой Антося спрабуе падаахвоціць свайго сына, і без яе прычытанняў ад няўдачы, без дзвюх маласлоўных размоў Цімоха з Толікам, без некалькіх дакладных назіранняў-штрыхоў. Зрэшты, у гэтым апавяданні, якое займае ў кнізе ўсяго каля пяці старонак, мне здаецца лішнім толькі адзін, заключны сказ, дзе аўтару захацелася даць яшчэ і вывад: «Яна плакала — у сям'і вырас мужчына». Думаецца, можна было б абысціся і без гэтага сентыментальнага абагульнення.

М. Капыловіч добра разумее свайго малога героя, тонка і дакладна суадносіць знешні свет з дзіцячай свядомасцю.

Апавяданне «У ружовым тумане» расказвае нам трагічную гісторыю гібелі малога Лёнькі: крывадушны сусед накіраваў хлапчука пад нямецкія кулі, каб тым часам уратавацца самому. Усё ў апавяданні як быццам не выходзіць за межы дзіцячых успрыняццяў. Празаік расказвае нам толькі тое, што ў полі зроку і разумення Лёнькі: хлапчук сядзіць у хаце, сочыць за матчыным заняткам, ратуецца, уцякаючы ад фашысцкіх карнікаў, упершыню сустракаецца з подласцю і незразумелай жорсткасцю, і гіне, нават не ўсвядоміўшы да канца, што сусед Ігнат — шкурнік, нягоднік.

Пісьменнік беспамылкова знаходзіць тыя падрабязнасці, што запыняюць увагу хлапчука, і праз іх раскрывае духоўны свет свайго маленькага героя. Яго Лёнька чуе, як «страляў мароз-траскун у сцяне», ён па-дзіцячы цікаўна сочыць праз намёрзлую шыбіну, што робіцца на двары, вольна бавіцца ў абжытым цяпле роднай хаты, ліхаманкава-няўцямна ратуецца ад карнікаў... І ад усяго гэтага апавяданне набывае яшчэ большае драматычнае гучанне: балюча і горка ад таго, што загінуў гэты маленькі жыццялюб.

Апавяданне «Па хлеб» таксама моцнае псіхалагічна дакладнай перадачай няпростых душэўных зносін дзяцінства з дарослым светам. Калі б Лёнька застаўся жыць, пэўна б і ён, як хлапчук Дзімка, герой гэтага апавядання, мусіў бы ўставаць цемнатою і вазіць на продаж у раённы пасёлак сена, каб зарабіць буханку хлеба. І зноў жа — пісьменнік паказаў нам праўдзіва і натуральна дзіцячую свядомасць у нялёгкім гарапашным клопаце, змусіў нас з хваляваннем і тугою сачыць за гэтым клопатам, нанова перажыць той колішні дзіцячы і голад, і холад, памог убачыць загартоўку слабай дзіцячай душы.

Апавяданні пра дзяцінства здаюцца мне, такім чынам, удачамі М. Капыловіча, хоць і не ва ўсім бясспрэчнымі. Апавяданню «Птушыны бацька», напрыклад, нестае сцісласці, пабудавана яно, як і большасць апавяданняў кнігі, з асобных эпізодаў, прычым на некаторыя з іх прыпадае зусім мала дзеяння — яны выпадковыя, і адчуваеш, што развязка прадвызначана з першых старонак: адразу ведаеш, што гнёзды, аб якіх клапоціцца хлапчук-пастушок, будуць разбураны злым і жорсткім Грышкам...

Але вось апавяданні, у якіх расказваецца пра сённяшняе жыццё, пра нашых маладых сучаснікаў — «Не прыедзе», «Дзень чужога жыцця», «Тапаліны пух». Чытаеш і здзіўляешся: малады празаік быццам не ведае і не разумее сваіх равеснікаў. Апавяданні гэтыя схематычныя. Іх героі пазбаўлены хоць колькі-небудзь значнага духоўнага жыцця.

Аб чым апавяданне «Не прыедзе?» Да маладога настаўніка Ігара прыязджае дзяўчына. Яна кахае Ігара, але не хоча жыць у вёсцы, якая здаецца ёй сумнай і бязлюднай. Ігар жа трымаецца іншай думкі: «Скрозь жывуць людзі». Праходзіць дзень і каханне Іны знікае: Ігар пачынае здавацца ёй шэрым і нецікавым. Зрэшты, ён такім і выглядае ў апавяданні, бо гаворыць прапісныя ісціны («мяняецца час, мяняюцца абставіны, мяняемся і мы»), духоўная змястоўнасць яго жыцця ні ў чым не выяўляецца.

Апавяданне быццам бы пра выпрабаванне пачуццяў: «За гэты год яна стамілася чакаць яго... забыла пра свае пачуцці, якія незаўважна міралі, выветрываліся ў яе душы...» Але ж пачуццяў, па сутнасці, і не было. Колісь Іне крыху падабаўся «прыгожы, модна апрануты» студэнт, і з ім «было ёй добра і цікава». Цяпер жа ён апрануты горш, і «ранейшая радасць і блізкасць да Ігара недзе апала, згубілася ў душы». Сур'ёзных духоўных адносін паміж героямі няма, і марнымі здаюцца спробы аўтара паказаць іх унутранае развіццё: «хацела сказаць нешта важкае... ды не знайшла»; «ён таксама хацеў сказаць нешта пераканаўчае... але не знайшоў»; «былі нейкія хвіліны разгубленасці... Яны замерлі, затаіліся ў нейкім напружаным імгненні. У яго душы варухнулася нешта новае, невядомае...» і г. д., і д. п.

Аўтар намагаецца яшчэ ўзмацніць напружанне, актывізуючы пейзаж, але гэта толькі падкрэслівае жыццёвую і літаратурную банальнасць усёй гісторыі. «Нясцерпная халадэча», «гразная і пакутлівая» дарога, «пякучыя і казытлівыя» ручаі дажджу, нарэшце — «сонца, уморанае за дзень да чырвані»... Усё гэта сведчыць толькі пра невысокі псіхалагічны і мастацкі ўзровень твора.

Астатнія з названых апавяданняў яшчэ слабейшыя. У апавяданні «Тапаліны пух» перажыванні героя — студэнта тэатральнага інстытута — і назіранні аўтара ўпарта чапляюцца за «гарнітурныя» падрабязнасці: «апранутыя ў модныя касцюмы», «у просценькай сукенцы дзяўчына», «на Галі зусім нямодная сукенка», «у стракатых сукенках-парасонах».

І ў апавяданні «Дзень чужога жыцця» няма складанасці чалавечых адносін, этычны канфлікт у іх на паверхні, і жыццёвыя вывады, якія робіць герой разам з аўтарам, — зноў жа банальна-малазначныя. Малады настаўнік Мацэвіч паказваецца ў час душэўнай няпэўнасці, калі ён спрабуе вырвацца з будзённшчыны, па-абывацельску звычнага, бездухоўнага існавання. Але пачуццё незадаволенасці сабой блукае і губляецца ў павярхоўных, знешніх апісаннях: «снавалі таксі», (яны, між іншым, «снуюць» не толькі ў гэтым апавяданні), «паўз Аляксея шыбавалі хлопцы і дзяўчаты з радаснымі, свежымі тварамі, з транзістарамі ў руках» (гэта ўжо і стылёва неахайна), «на рукі былі напяты скураныя пальчаткі»... Увесь пошук героя ацiхае, нарэшце, у лірычна-сентыментальным пейзажным шматкроп'і: «Недзе за горадам танула за лес сонца...».

Асобныя ўдачы пісьменніка губляюцца ў кампазіцыйных і апавядальных штампах; жыццёвая сфера маральна-этычных пытанняў, што цікавяць аўтара, звужаецца ардынарнымі ў сваёй павучальнасці вывадамі. І гэта непакоіць. Якімі будуць наступныя крокі маладога пісьменніка ў асэнсаванні жыцця?..

Праўда, апавяданне «Пустальга» абнадзейвае. Яно — пра чалавека іншага вопыту і ўзросту, пра пажылога вяскоўца Данілу, бадай што няўдачніка. Жыве Даніла небагата, працуе сумленна і шчыра, церпіць кепікі і здзек ад нахабнага ў сытай самазадаволенасці суседа Максіма, скнары і спекулянта. Максім на працягу ўсёй гісторыі мае перавагу над Данілам, несправядлівасць раз за разам абрушваецца на героя апавядання, а нядбайнасць падводчыкаў (сярод іх і Максім), з якімі Даніла вазіў сена, ледзь не прывяла яго да гібелі. Але Даніла не траціць сваёй дабраты і спагадлівасці, застаецца жыццёва актыўным і душэўна прыгожым. І што вельмі важна: пісьменнік пераканаўча паказвае ўнутранае жыццё героя, добра разумее і адчувае яго характар.

У аўтарскай танальнасці выразна чуецца і зычлівая ўсмешка, і ўважлівае стаўленне да кожнай драбніцы Данілавых клопатаў — імі асветлена ўсё апавяданне, кожны эпізод. Вось хоць бы гэты штрых, які добра паказвае характар Данілы: «...не ўдаўся ростам Даніла, быў дробненькі, як той верабейчык. Затое Даніла быў хуткі на ногі. Вечна ён некуды спяшаецца, і там, куды заўсёды бяжыць, без яго ніяк, здавалася, не абыйдуцца. На калгасную работу — трушком, на вяселле — бежкі...» І тут пісьменнік не прапануе вывадаў — павучанняў. Усё апавяданне шмат гаворыць пра яго маральна-этычную пазіцыю, вучыць, як павінны жыць людзі...

Вось гэтае апавяданне «Пустальга», а таксама апавяданні пра дзяцінства — тое, што дае, на маю думку, падставы гаварыць пра першую кнігу М. Капыловіча — ва ўсякім разе пра лепшае ў ёй — як пра ўдалую творчую заяўку маладога празаіка.

Варлен БЕЧЫК.

Мікола Капыловіч. «Скрозь жывуць людзі». Апавяданні. Выдавецтва «Беларусь». Мінск. 1968.

СЯБРУЮЦЬ СУСЕДЗІ

Працоўныя Мсціслаўшчыны сябруюць са сваімі суседзямі са Смаленшчыны — працоўнымі Хіславіцкага раёна. Сустрэчы, абмен вопытам, сумесныя грамадскія і культурныя мерапрыемствы мацуюць гэта сяброўства. Неаднойчы гасцявалі хіславіцкія калгаснікі на Мсціслаўшчыне. неаднойчы працоўныя Мсціслаўшчыны наведвалі сваіх сяброў-суседзяў.

Актыўна супрацоўнічаюць і раённыя газеты: яны абменьваюцца матэрыяламі аб вопыце перадавікоў, праводзяць сумесныя сустрэчы з чытачамі.

Нядаўна, напрыклад, хіславіцкая газета «Заря коммунизма» змясціла матэрыялы аб працоўных буднях суседзяў, падборку вершаў членаў Мсціслаўскага літаб'яднання В. Лук'янчыка, В. Шабанскай, Л. Кандратава.

У сваю чаргу, мсціслаўская раённая газета «Святло Кастрычніка» змясціла літаратурную старонку твораў сваіх рускіх сяброў, надрукавала вершы Н. Фомкіна, М. Веліканава, Б. Пруднікава, гумарэскі В. Усава.

Г. ЮРЧАНКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

ПАКУЛЬ ВЫ МАЛАДЫЯ...

У моладзі, якая прыходзіць у літаратуру, радуе многае. Радуе шчырасць, сардэчнасць, натуральнасць іх галасоў, жаданне сказаць нешта важнае, значнае пра час і пра сябе, пра сваіх аднагодкаў, радуе сур'ёзнае, удумлівае стаўленне да літаратуры. Радуе, урэшце, і тое, што сёння ў літаратуру моладзь прыходзіць адукаваная, ідэйна і тэарэтычна падрыхтаваная.

Але, на жаль, многае ў творах маладых і засмучае, расчароўвае і нават насцярожвае. Часта ў іх адсутнічае глыбокая, значная думка, часам адчуваецца боязь кранууца важных, надзённых праблем жыцця. Карацей кажучы, многім маладым пісьменнікам нестае шырыні погляду на свет і людзей.

Засмучае тэматычная абмежаванасць творчасці маладых. У паэзіі, праўда, тэматычныя абсягі здаюцца часам шырэйшымі, а вось у прозе мае месца абмежаванасць тэм і матываў, некаторыя маладыя, нібы згаварыўшыся, пішуць пераважна па ўспамінах маленства.

А жыццё ж — невычэрпнае і разнастайнае. На Беларусі, асабліва ў пасляваенныя гады, адбыліся велізарныя пераўтварэнні. Выраслі новыя заводы і фабрыкі, новыя гарады, вырас рабочы клас, тэхнічная і навуковая інтэлігенцыя. Здавалася б, менавіта маладыя скажуць пра ўсё гэта сваё важкае слова. Каму ж, як не ім, быць пачынальнікамі, адкрывальнікамі новага! Аднак гэтых тэм кранаюцца толькі нямногія маладыя пісьменнікі. А калі кранаюцца, дык, на жаль, пакуль што нясмела.

Зрэшты, на маю думку, і пра вёску мы ў апошні час пішам менш. Гэты папрок я адрасую і старэйшым пісьменнікам, у тым ліку і самому сабе, і маладзейшым. Я пра гэта ўжо гаварыў, аднак скажу яшчэ раз. Наша вёска сёння зусім не тая, якой была дзесяць, нават пяць гадоў назад. Змянілася жыццё, змяніліся і людзі, іх побыт, узаемаадносіны. На жаль, тых працэсаў, што адбываюцца ў сённяшняй вёсцы, новых узаемаадносін паміж людзьмі літаратура наша чамусьці не заўважае.

Увогуле, трэба шчыра сказаць, што многім нашым маладым літаратарам бракуе грамадзянскай актыўнасці. Пакуль што яны вельмі неахвотна і нясмела бяруцца за адлюстраванне важнейшых канфліктаў і праблем часу.

І ў гэтай сувязі хочацца сказаць вось пра што. Мы хацелі паслаць на нараду маладога драматурга. Але, як ні прыкра, такой кандыдатуры не знайшлося. Пасля Анатоля Дзялендзіка ў нашай драматургіі не паявілася новага яркага імя. У чым прычына! Мне думаецца, менавіта ў гэтай боязі маладых пісьменнікаў сучасных канфліктаў, сучасных праблем. У драматургіі гэта асабліва відавочна. Тэатр, як вядома, проста не можа абысціся без сучасных характараў, без сучасных канфліктаў.

Думаю, аднак, што ўсе гэтыя беды, пра якія я гаварыў, — звычайныя хваробы росту. Галоўнае тое, што моладзь ідзе ў літаратуру таленавітая, адукаваная, ідэйна ўзброеная, ідзе з вялікім жаданнем і шчырымі намерамі працаваць на карысць роднай літаратуры, роднага народа.

— Што б вы хацелі пажадаць пасланцам Беларусі на Усесаюзную нараду і ўвогуле беларускай літаратурнай моладзі?

— Усесаюзная нарада маладых пісьменнікаў — гэта чарговы агляд маладых літаратурных сіл народаў нашай краіны, маладой савецкай літаратуры. Разам з тым нарада павінна стаць і школай літаратурнага майстэрства для яе ўдзельнікаў. У часе нарады адбудзецца шырокае абмеркаванне агульналітаратурных праблем, будуць працаваць — пад кіраўніцтвам вопытных літаратараў — творчыя семінары па жанрах. Усё гэта, трэба спадзявацца, прынясе моладзі вялікую карысць.

Вельмі важна і тое, што маладыя пісьменнікі з розных куткоў краіны пазнаёмяцца паміж сабой, пасябруюць. Гэта з'явіцца першай прыступкай для іх далейшых творчых кантактаў. Такія кантакты неабходны. Бо дружба літаратараў— гэта дружба літаратур.

Пятая Усесаюзная нарада маладых пісьменнікаў склікаецца ў час, калі ўся краіна рыхтуецца да 100-годдзя з дня нараджэння Уладзіміра Ільіча Леніна. Гэта, безумоўна, у многім вызначыць змест і характар той творчай размовы, якая адбудзецца ў часе нарады. У ёй важнае месца зоймуць пытанні грамадзянскай актыўнасці маладых літаратараў, іх цеснай сувязі з жыццём народа, пытанні камуністычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Хочацца пажадаць усім удзельнікам нарады плённай работы, карысных абмеркаванняў і сустрэч, багатых уражанняў.

Што ж датычыцца ўсёй нашай літаратурнай моладзі, на якую мы ўскладаем вялікія надзеі, дык, як я ўжо гаварыў, хацелася б бачыць яе больш няўрымслівай, творча — а галоўнае — душэўна, грамадзянска больш актыўнай. Маладым трэба быць маладымі — гэта значыць быць нястомнымі шукальнікамі, не супакойвацца на дасягнутым, не губляць творчага энтузіязму.



Гэта аповесць пра невялікую вёску Буднеў, пра яе людзей, — і тых, каго ўжо няма, хто жыве толькі ў памяці аднавяскоўцаў, родных і блізкіх, і тых, што і цяпер жывуць і працуюць,—хто ў Будневе, хто ў другіх месцах. А яшчэ гэта аповесць — пра любоў да зямлі, на якой чалавек нарадзіўся і вырас, пра ўдзячнасць ёй і людзям.

Няма нічога лепшага за раніцу ў матчынай хаце. Яшчэ сон звівае павекі, іх цяжка і лянота разарваць, і розум яшчэ поўнасцю не прачнуўся, то прарываючыся да яснаты цвярозага азарэння, то патанаючы ў салодкім тумане забыцця, а ўжо радасць, што ты зноў дома, як быццам і не з'язджаў адсюль ніколі, радасць зварота ў самага сябе — ранейшага, малога, нейкага другога і разам з тым такога ж самага, як і цяпер, жыве ва ўсім целе. Прыемны цягучы боль у касцях і ва ўсіх мускулах пасля ўчарашняй дарогі наводзіць на думку аб вялікім, нечалавечым шчасці.

А маці ўжо даўно ўстала і асцярожна, каб не разбудзіць, тупае па хаце. Яна ўжо наабірала бульбы, перамыла яе і цяпер перакладвае дровы ў печы. Нават і так, лежачы ў пасцелі з заплюшчанымі вачыма, можна бачыць, як яна паклала адно палена, трошкі воддаль другое, і ўжо на іх кідае ўсе астатнія, і яны лоўка, з глухім стукам лажацца адно на адно, упоперак тых двух, першых. Адно паленца скацілася на под, і маці нагінаецца ў печ, дацягваецца рукой да яго, не чуючы, як лоб чыркануў аб дугу нізкага, задымленага чалесніка і як ад гэтай дугі на ілбе, трошкі вышэй правага брыва, засінела яшчэ адно брыво, як сярпок затушoванага месяца. Гэты сярпок будзе цямнець, аж пакуль яны не сядуць за стол і пакуль ён не скажа ёй зірнуць у люстэрка.

Дровы цяпер ляжаць добра, цяпер можна па-класці падпал — шматок газеты, стружку бяросты, зубок карча. Пакуль язычок полымя чапляецца за газету, пакуль перакінецца на бяросту і яна адразу скурчыцца, чорна і тлуста задыміць, пакуль засмалянее, затрашчыць корчык і ўжо за ім — асцярожна і неахвотна — дровы, можна замахнуць попел і вугалькі з прыпечка ў пяколак, наліць вадой чыгуны з бульбай: два вялікія — свінням і адзін маленькі — сабе...

А тут якраз голас на вуліцы. Здаецца, гэта цётка Волька:

— Лёкса! Лё-ё-ёкса!?!

Маці выбягае на ганак, пакінуўшы адчыненымі дзверы, і адразу ў хаце халаднее ад ядранага паветра. З двара даносяцца перагаворы.

— Ці тэ не думаэш выпускаць карову? Ці тэ не падоіла? — Гэта яна, цётка Волька, гэта яе нязменны голас. Можна нават уявіць і яе самую: з галавой, абвязанай цёплай хусткай, у куфайцы і даўгой суконнай спадніцы, якая ледзь ліпіць на плоскіх вузкіх клубах.

— Падаіць то падаіла, ды што яны цяпер там знойдуць?

— Знойдуць не знойдуць, хоць на волі пахадзяць. Заганю за Агея, хай шукаюць. Чарнагаловік там адскочыў; учора ішла, бачыла.

Рыпяць вароты хлева і па двару ідзе карова, чокаючы капытамі, і свіння з хлеўчука падае галодны голас.

І зноў ласкавы туман забыцця, здаецца, імгненны, а на самай справе паўгадзінны, разрываецца грубым і моцным:

— Добры дзень у хату!

Гэта ўжо Вавіла.

— Дзіндобры! — адказвае маці і пазірае ў печ, на скавараду, дзе бялее і на вачах пачынае пухнуць блін.

— Хто гэта ў цябе? Ці не Герман прыехаў? — грубы голас быццам мякчэе, спускаецца да прыемнага здзіўлення.

— Ага, ноччу...

— І адзін ішоў?

— З Мікулічавым удвух. Але казаў, што шмат ехала. Данілаў унук, Патапаў хлопец, Вера Зайцава...

— Пётры?

— Ага.

— Адна?

— Як бытта. — Маці грыміць скаварадой, налівае другі блін.

— Яна ж, чуваць, развялася са сваім. Не ўпадабала афіцэрскі паёк. Мусіць, большы шукае...

— Не ведаю, большы ці меншы. Да Клаўдзі паехала ў Закуцце.

— Ну, на бацькаву магілу то яны прыбудуць. Раданіца. Яны гэта саблюдаюць. Ды і года ж няма, як памёр...

— І грэх быў бы, каб не прыехалі. Ён жа глядзеў іх.

— Да... Хоць і глухі быў, як пень, а іх шанаваў...

У гаворцы наступае перамежак — чуваць, як страляюць дровы ў печы, і зноў Вавілава— размякчанае і быццам турботлівае:

— Хай бы сказала мне, што Герман прыедзе, каня даў бы. А то поначы і можа яшчэ з грузам...

— Я не ведала, якім ён прыедзе, ды або я сама па яго паеду?..

— І гэта праўда... А ён ужо і не спіць, — Вавіла павесялеў, убачыўшы, што Герман адплюшчыў вочы. Зрабіў два шырокія быстрыя крокі ад парога да ложка: — Здароў, Лявонавіч. Кажаш, і паспаць не даюць?

Герман выпроствае руку з-пад коўдры, здароўкаецца. Вавіла ўзвышаецца над ім шыракаплечай павукападобнай тушай. Няголены твар яго ўспухлы: ці ад недасыпу, ці ад перасыпу.

— Я ж кажу маці, — працягвае тым часам Вавіла, — чаму мне не сказала. Можна ж было каня запрэгчы. Яны ўсёадно гуляюць. Мой меншы мог бы і падскочыць.

— А я прывык пехам, —Герман прыўзнімаецца на падушцы, смяецца, але з пасцелі не ўстае, і Вавіла пасля некалькіх традыцыйных пытанняў пра тое, як там і што ў сталіцы, паварочваецца да маці...

— Гэта ж я зайшоў сказаць, каб ты падышла пад канцы, пасобіла бульбу перабіраць. Можа да абеда пасядзела б? Арына пойдзе, Маня, Гуня,

— Ды не, Вавіла. Як жа я пайду. Сам бачыш — госць прыехаў. Хочам да абеду гной выкінуць на соткі, ну а пасля — на могілкі пойдзем.

— Яно то так. На могілкі і я пайду. Трэба сваіх праведаць, магілкі падправіць. — Ён ідзе да дзвярэй, бярэцца за клямку. — А можа сходзіш? А заўтра Герман ушчэміць якога каняку ды на калёсах і выкінеце гной?.. Колькі там яго ў цябе?..

— Не. Заўтра яму ехаць трэба. — Маці не хавае, што ёй надаела ўся гэта гаворка. — Пашукай каго з маладзейшых. Хіба акрамя Лёксы няма нікога...

— Буду шукаць, дзе ж я дзенуся. — Вавіла пазірае на Германа, быццам пытаецца. — А, думаеш, так проста знайсці? У кожнага нешта сваё маецца. А сёння яшчэ дзень такі... — і нечакана мяняе гаворку: — Уставай, Лявонавіч, ды пойдзем да мяне. Па чарчыне возьмем, пагамонім. Люда ж мая цяпер дома.

— Не ведаю...

— Як-небудзь ужо ў другі раз. Сёння няма калі, — рашуча ўмешваецца маці. — Работы сёння шмат.

— Работа не дзеўка, нікуды не дзенецца. Будзеш у маім канцы — заглянь. Люда пра цябе пыталася. Як ведала, што прыедзеш. І нам ёсць пра што пагаварыць...

Вавіла выходзіць, згінаючы галаву ў дзвярах. Маці стаіць, абапёршыся на чапялу, пазірае ў печ.

— Бегае па хатах, шукае, дзе б галаву прывязаць. Каб цябе не было, дык папрасіў бы сто грам. А так пасцясняўся. Дажа сам паклікаў. Яму жонка не дае, а калі б з табой... А выпіць беднаму хочацца, хочацца. Учора ў Міколкі хрэсбіны былі, ну, і ён, канешне, быў...

Герман маўчаў. Ён ляжаў на ложку, усміхаўся сабе, але ў душы ўжо пракрадвалася нейкая незразумелая трывога. І быццам тая радасць, што нядаўна пранізвала яго ўсяго, і шчасце, якім ён быў толькі што напоўнены, прышэрхла, пакрылася пылам.

— Дык уставай, Лявонавіч, — сказала маці, бліснуўшы ў яго бок вачыма.— Бач, як цябе велічае. Лявонавіч. Думае, можа зяцем яшчэ будзеш...

І матчыны словы, і ласка яе, і такі знаёмы дамашні пах печанага сала з каўбасой зноў вярнулі Герману адчуванне радасці жыцця, радасці, што ён зноў дома і бачыць клопатную немітуслівую матчыну работу, і што яна ёсць, жывая — усё такая ж руплівая, эканомная, прасветленая, з зацiснутымі пад хустку русымі — без прыкмет сівізны — валасамі. І ён успомніў пра той страх, што часам накачвае на яго там, у Мінску, калі доўга няма ад яе пісем, і парадаваўся гэтаму страху, таму што ён гоніць яго на вакзал, у цягнік, а пасля — дзесяць кіламетраў са станцыі, калі бяжыш усё скарэй і скарэй, баючыся, каб з ёй усё было добра, і не верыш у сваю боязь, і потым стаіш на двары, пастукаўшы ў шыбу, напружана чакаеш, калі пачуецца лёгкі шоргат і жывое варушэнне на печы. Бліснe святло, і вось ужо ён абнімае яе — цёплую ад печы, маленькую, бездапаможна зажмураную ад яркага святла, у спехам надзетай прасторнай сукенцы, адчувае шурпатасць разагрэтай сном мяккай шчакі і пакатасць вузкіх прыгорбленых плячэй...

...Пасля снедання пайшлі ў хлеў. Герман уздзіраў віламі гной, накідаў на насілкі, стараўся навальваць на свой край больш, каб маці было лягчэй.

Зямля на сотках падсохла, і толькі ў лагчынцы, за хатай, у баразнах цвіла шэрай плесняю вада, і ногі грузлі ў цягучай хліпкай мяккаці.

Гаварылі мала — спакойна, суладна думкам і настрою. Герман як бачыш разагрэўся, здзеў пінжак. Маці таксама зачырванелася тварам... І накопваючы гной, і несучы яго, і гаворачы з маці, ён жыў у сабе. Ён думаў пра сон, што прысніўся яму сёння ноччу і ўзбударажыў яго. Ніколі Герман не сніў такога прыгожага і страшнага сну. І гэты сон быў часцінкай сённяшняга дня, які абяцаў быць добрым.

Сон быў пра коней. Аднекуль, здаецца, з Яблоншчыны, Герман ішоў дамоў. Ішоў, мякка чуючы пад босымі нагамі гарачы дарожны пясок. Пахла пылам і палыновай горасцю, і Германа нешта трывожыла, непакоіла. Ён раз-пораз кідаў позіркі на неба. На захадзе яно зацягвалася цёмнай хмарай, зацягвалася знізу, ад зямлі, як перад сном зацягваецца плёнкай круглае курынае вока. Герман не памятаў, што трывожыла яго — ці гэта чарната, што ўсплывала, разрастаючыся, ад зямлі, ці што другое. Але гэтыя незразумелы страх падганяў яго, прымушаючы ісці хутчэй і хутчэй. І раптам Герман улавіў за сабою ледзь чутнае цоканне капытоў — быццам нехта далёка і не надта хутка ехаў на кані. І цяпер страх, што цясніўся ў Германа ў грудзях, набыў рэальнае і канкрэтнае асэнсаванне. Герман баяўся гэтага конскага тупату!

І ён кінуўся бегчы дамоў, хутчэй дамоў. Толькі дом мог выратаваць яго ад гэтага конскага тупату. Герман бег і ўвесь час азіраўся назад, на неба. І падбягаючы ўжо да свайго сяла — яно нешта было зусім пустое і складалася ўсяго з адной хаты — іхняй хаты, — Герман убачыў, што на небе, якраз на тонкай кромцы чорнай хмары, ляцяць, вырастаючы на вачах, два блакітныя калі. Суладны тупат іх — тра-та-та! — тра-та-та! — тра-та-та! — быццам яны нес-

[Заканчэнне на 4-й стар.]

Госці МІНСКА

ПЕРШАЕ ЗНАЁМСТВА

МАЛАДАЯ шведская піяністка Інгер Вікстрэм паспела ўжо аб'ездзіць з канцэртамі ледзь не ўсе краіны Еўропы і, акрамя таго, чатыры разы гастралявала ў ЗША, выступала ў Бразіліі, Ізраілі і іншых краінах свету. Публічныя выступленні Інгер пачала васьмігадовай дзяўчынкай, а ў шаснаццаць гадоў яна ўжо давала першы самастойны сольны канцэрт у Стакгольме. Нягледзячы на гэта, сваім артыстычным дэбютам, які адкрыў шлях на канцэртныя эстрады свету, піяністка лічыць сольнае выступленне ў Лондане ў 1959 годзе.

Мастацтву фартэпіяннай ігры Інгер Вікстрэм навучалася ў Стакгольме, у Лондане і ў Вене. У Стакгольме яна займалася ў прафесара Готфрыда Бона, у Лондане—у венгерскага музыканта Імрэ Кабаш, у Вене — у прафесара Бруна Зайдльхофера. Такая частая змена педагогаў і месц навучання вельмі характэрная для маладых заходнееўрапейскіх піяністаў.

У Савецкі Саюз Інгер Вікстрэм прыязджае трэці раз. З яе выканаўчым мастацтвам ужо знаёмы слухачы Масквы, Ленінграда, Кіева, Тбілісі, Таліна і іншых гарадоў нашай краіны. І невыпадкова ў яе канцэртным рэпертуары побач з творамі заходнееўрапейскіх кампазітараў шырока прадстаўлены творы Чайкоўскага, Мусаргскага, Рахманінава, Стравінскага, Пракоф'ева і Шастаковіча. Піяністцы падабаецца руская класіка і савецкая музыка. Яна цёпла гаворыць аб Савецкім Саюзе, з вялікай павагай адгукаецца аб савецкай фартэпіяннай школе і яе буйнейшых прадстаўніках — Рыхтэры і Гілельсе.

20 і 22 сакавіка ў канцэртнай зале Беларускай філармоніі адбыліся сольны і сімфанічны канцэрты Інгер Вікстрэм. У першым з іх піяністка выканала тры буйныя, зусім розныя па стылю творы Дэбюсі, Шуберта, Мусаргскага і некалькі мініяцюр зарубежных кампазітараў, у другім—фартэпіянны канцэрт Грыга і таксама некалькі п'ес малой формы.

З першых жа гукаў «Прэлюдыі», якая адкрывала цыкл Дэбюсі «Для фартэпіяна», Інгер Вікстрэм паказала сябе чулым і ўдумлівым музыкантам. Усе тры п'есы цыкла былі сыграны мякка, прыгожа, высакародна, з падкрэсліваннем маляўнічых выразных бакоў фартэпіяннай тэхнікі. Пры гэтым не адчувалася ніякага націску, ніякага імкнення бліснуць хуткасцю бегласці пальцаў. Усё было проста, натуральна і дакладна. Асабліва цікавыя фарбы былі знойдзены ў «Сарабандзе», выкананне якой нагадвала журботны расказ пра лёс чалавека.

Не менш тонка і своеасабліва была інтэрпрэтавана, сі-бемольмажорная саната Шуберта, у якой артыстка перш за ўсё падкрэслівае камерна-інтымны характар лірыкі гэтага кампазітара. Праўда, сузіральнае ўспрыманне невычарпальнага харства музыкі, імкненне перадаць найтанчэйшыя дэталі шубертаўскага тэксту часам пераважалі над дынамікай і экспрэсіяй. Магчыма, іменна таму першая частка сонаты здалася некалькі расплыўчатай і статычнай, а фінал — недастаткова яркім і ігрывым, хоць увогуле, выконваючы санату, І. Вікстрэм прадэманстравала тонкі густ, адчуванне фартэпіянных фарбаў і выдатнае піянісцкае майстэрства.

У другім адзяленні канцэрта, амаль цалкам прысвечаным «Малюнкам з выстаўкі» Мусаргскага, піяністка ярка перадала не толькі вобразны змест, але і псіхалагічны, а часам і сацыяльны падтэкст кожнага нумара, не страціўшы пры гэтым адчування адзінства і цэласнасці. Праўда, асобным нумарам цыклу, напрыклад, такім, як «Цюільрыйскі сад» або «Лімож. Рынак», можна было б пажадаць большай унутранай усхваляванасці, а «Волатаўскім варотам» — паўнагучнасці, эпічнай шырыні. Аднак нашы пажаданні ніколькі не змяншаюць мастацкіх вартасцей інтэрпрэтацыі І. Вікстрэм, дзе амаль пунктуальна перададзены аўтарскія нюансы, штрыхі і рэмаркі. Падобнае стаўленне да аўтарскага тэксту ўласціва далёка не кожнаму выканаўцу.

Аналагічная вобразнасць, закончанасць і дакладнасць адчуваліся ў выкананні мініяцюр Грыга («Накцюрн», «Карагод гномаў», «Матылёк»), Шапэна (Прэлюдыя соль-мінор), Дэбюсі («Дзяўчына з валасамі колеру лёну»), Віла-Лобаса («Серэнада») і Назары («Адэон»), сыграных звыш праграмы.

Сольны канцэрт Інгер Вікстрэм паказаў, што найбольш моцным, найбольш запамінальным бокам выканаўчага таленту піяністкі з'яўляюцца не віртуозны бляск, а дакладнасць і глыбокае пранікненне ў змест твораў. З гэтымі якасцямі непарыўна звязана гранічна чулае стаўленне да фартэпіяннага гуку і сапраўды майстэрскае валоданне рознымі градацыямі нюансаў «р» і «рр». Цяга да піянізму камерна-лірычнага плана зусім не выключае асобных дынамічных нарастанняў, праяўлення момантаў экспрэсіі, драматызму і сілы, але кожны такі ўнутраны парыў успрымаецца як невялікі астравок на празрыстым фоне лірычных фарбаў.

Інтэрпрэтацыя І. Вікстрэм Канцэрта Э. Грыга для фартэпіяна з аркестрам пацвердзіла гэтыя ўражанні і, разам з тым, адкрыла і новыя якасці выканаўчага стылю піяністкі,— у прыватнасці, віртуозн асць. У яе гамавобразных пасажах адчуваецца дынамізм і дакладнасць, у актавах — лёгкасць і свабода. Але зноў-такі ва ўсіх тэхнічна складаных месцах не было пагоні за знешнімі эфектамі, а ярка перададзенае імкненне да старанная гукавай і тэхнічнай аддзелкі. Паспяховаму выкананню Канцэрта Грыга садзейнічала чулае суправаджэнне сімфанічнага аркестра пад кіраўніцтвам В. Катаева.

У той вечар аркестр выканаў Дзесятую сімфонію Д. Шастаковіча (напісана ў 1953 годзе), якая прагучала як рашучы пратэст супраць зла, жорсткасці і змроку, як трывожны роздум аб сучасным свеце, і «Маленькі трыпціх» Г. Свірыдава (1965 год) — тры мініяцюрныя замалёўкі з рускага жыцця, тэматычна, звязаныя з творчым пафасам гэтага самабытнага сучаснага кампазітара.

У Мінску адбыліся два цікавыя і змястоўныя музычныя вечары, у часе якіх публіка ўпершыню пазнаёмілася з таленавітай піяністкай—Інгер Вікстрэм.

У. КОКУШКІН.



ПРЫВІТАННЕ, ВЯСНА!

Фотаэцюд М. МІНКОВІЧА.

РЭКАНСТРУКЦЫЯ ВЯЛІКАГА КРАМЛЁЎСКАГА ПАЛАЦА

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.]

Усю гэту каласальную па аб'ёму і дакладнасці працу правёў калектыў Ленінградскай навукова-рэстаўрацыйнай майстэрні, якая да таго ж аднавіла і тое, што было страчана ва ўбранні беласнежнай залы. Майстры, чые залатыя рукі паднялі з руін разгромленыя фашысцкімі акупантамі палацы Петрадварца, Паўлаўска, Пушкіна, аддалі сваю энергію, вопыт, сілы рэстаўрацыі Крамля.

Мармуровыя дошкі на сценах Георгіеўскай залы — своеасаблівая гісторыя рускай арміі — зноў маюць свой ранейшы бляск. Тое самае адбылося і з масіўнымі дзвярыма, упрыгожанымі разным арнаментам. Здаецца, нібы яны толькі што выраблены.

Тысячамі брыліянтавых агнёў адбіваецца на паркеце (яго плошча дасягае 1200 квадратных метраў) святло велізарных бронзавых люстраў.

Васьмігранная Уладзімірская зала, нягледзячы на параўнаўчаневялікія памеры, дзякуючы аркадзе-галерэі другога яруса і паліхромнаму дэкору, па архітэктуры не толькі не саступае, але і пераўзыходзіць многія іншыя памяшканні. Тут давялося, у прыватнасці, рэстаўрыраваць убранне купала, завершанага светлавым ліхтаром. Добра папрацавалі лепшчыкі, пазалотчыкі, чырванадрэўшчыкі Ілёўскай рэстаўрацыйнай майстэрні. Паміж масквічамі, ленінградцамі, кіеўлянамі нібы ішло спаборніцтва за высокую якасць работы. А работа была ювелірная — інакш і не назавеш.

Гранавітая палата — найбольш старажытная частка комплексу. Невялікі гістарычны экскурс. Спачатку цэнтральны чатырохгранны слуп палаты, абліцаваны белакаменнымі блокамі, быў упрыгожаны пазалочанай разьбой, а сцены і скляпенні распісаны. Пажар знішчыў гэты роспіс. Белакаменную разьбу счасалі і замянілі ў XVIII стагоддзі алебастравым рэльефам.

На аснове роспісаў жывапісца XVII стагоддзя Сімона Ушакова мастакі-паляшане браты Белавусавы ў 1882 годзе нанава распісалі палату. Рэльефную дэкарацыю слупа яны замянілі мастацкім арнаментам. Такім слуп і аказаўся перад рэстаўратарамі.

Вывучэнне старых дакументаў і праведзеныя на месцы пошукі прынеслі радасную знаходку: пад распіснымі шчытамі слупа знайшліся астаткі ссечанага пазалочанага арнаментальнага рэльефу.

Аднавіць яго ў першапачатковым выглядзе і матэрыяле аказалася немагчыма. І тады рэстаўратары прынялі іншае рашэнне. Мы ведалі, што яшчэ ў дваццатых гадах заслужаны дзеяч мастацтваў Мікалай Памяранцаў знайшоў у сховішчы былога Румянцаўскага музея часткі знятага са слупа алебастравага рэльефу XVIII стагоддзя. А раз узоры маюцца, то ёсць поўная магчымасць узнавіць згубленую рэльефную дэкарацыю ў гіпсе. Так і было зроблена. Але гэтаму папярэднічала ўмацаванне слупа пры дапамозе металічнай канструкцыі і ўвядзення ў белацаглянную кладку спецыяльнага раствору.

Ансамбль Екацярынінскіх залаў — Кавалергардская, Екацярынінская, Парадная канапная, Парадная зала для ландшынку. Арэхавы пакой. У кожнага з гэтых памяшканняў свая гісторыя.

Рэстаўрыруючы каштоўную мэблю, прадметы прыкладнога мастацтва, дзверы з інкруставанага палісандра, амаранта, чынары, чырванадрэўшчыкі прадэманстравалі цуды майстэрства. Праславіліся таксама лепшчыкі, пазалотчыкі, мармуршчыкі. Дзякуючы іх намаганням ліквідаваны ўсе пашкоджанні, якія былі нанесены дэкору ансамбля.

З першага погляду ў вялікай, двухсветлавой зале пасяджэнняў, якая ўмяшчае каля 2500 чалавек, усё засталося па-ранейшаму. Сапраўды, архітэктурнае рашэнне захавана былое. Тым не менш будаўнікі шмат тут папрацавалі. Дастаткова сказаць, што трыбуна прэзідыума, падлога партэра і балкона зроблены нанава, па сталёвых бэльках. Павялічана колькасць ложаў для дыпкорпуса. Ажыццёўлена дасканалая сістэма вентыляцыі, кандыцыяніравання паветра, электраасвятлення. На балконе і ў ложах — новая мэбля.

Заканчваючы нашу гутарку, Уладзімір Лібсан яшчэ раз падкрэсліваў, што поспех рэканструкцыі і рэстаўрацыі — вынік шматгадовых і карпатлівых навуковых пошукаў, настойлівай, напружанай працы шматлікага калектыву высокакваліфікаваных спецыялістаў — прадстаўнікоў розных гарадоў, разнастайных прафесій. Заказы і пастаўкі выконвалі дзесяткі прадпрыемстваў.

Першая чарга работ завершана. Наперадзе новыя цікавыя задачы.

Барыс БЕЛАГОРСКІ,
Генрых ЛІЎШЫЦ.
(АДН).

НОВАЯ КАНЦЭРТНАЯ ЗАЛА

У суботу 22 сакавіка ў спецыяльнай музычнай школе пры Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі адбылося ўрачыстае адкрыццё новай канцэртнай залы. Яна разлічана на 475 чалавек, мае вялікую сцэну, добрую акустыку, спецыяльную апаратуру ўзмацнення гуку, пакой магнітафоннага запісу, радыявузел. Тут зманціравана два кінаапараты, устаноўлены шырокі экран для дэманстрацыі вучэбных і навуковых кінафільмаў. Усё гэта стварае цудоўныя ўмовы для заняткаў навучэнцаў і работы выкладчыкаў.

Новая зала будзе выкарыстоўвацца не толькі для вучэбных мэт. Па суботах тут будуць наладжвацца камерныя канцэрты для мінчан — аматараў музыкі. Першы камерны канцэрт адбыўся 22 сакавіка. У ім прыняла ўдзел салістка Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета СССР, лаўрэат Міжнароднага і Усесаюзнага конкурсу імя М. Глінкі Алена Абразцова. Яна выканала рамансы Рахманінава, Рымскага-Корсакава, арыі з опер. Акампаніраваў спрачаны піяніст А. Ярохін (Масква).

Па сведчанні выканаўцаў і спецыялістаў - музыказнаўцаў, новая канцэртная зала адна з лепшых камерных залаў у нашай краіне.

МОЛАДЗЬ І КУЛЬТУРА ВЁСКІ

20—21 сакавіка ў калгасе імя Кірава Слуцкага раёна працавала вызная навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная ўдзелу моладзі ў далейшым уздыме культуры вёскі.

Канферэнцыя была арганізавана кафедрай марксісцка-ленінскай філасофіі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна і Мінскім абкомам камсамола. У яе рабоце прыняло ўдзел 150 чалавек — работнікі культурных устаноў, выкладчыкі БДУ, партыйныя і камсамольскія работнікі, старшыні калгасаў, дырэктары саўгасаў сталічнай вобласці.

З дакладамі, прысвечанымі ўдзелу моладзі ў далейшым павышэнні культуры на сяле, выступілі член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР, доктар філасофскіх навук В. Сцяпанаў, кандыдат філасофскіх навук В. Лапцёнак, загадчык сектара культурна-масавай работы ЦК ВЛКСМ С. Пылёў, першы сакратар Мінскага абкома камсамола К. Туровіч, старшыня калгаса Герой Сацыялістычнай Працы С. Мялешчанка і іншыя.

Удзельнікі канферэнцыі пазнаёміліся з ходам забудовы і добраўпарадкавання калгаснага гарадка, з вопытам работы калгасных культурна-асветных устаноў, прысутнічалі на канцэрце мастацкай самадзейнасці.

Г. ПРАВАЛОВІЧ

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 сакавіка

Першая праграма

10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — для дзяцей. «Умелыя рукі» (М). 11-00 — А. Волкаў. «Чараўнік Ізумруднага горада». Тэлевізійны лялечны спектакль. Частка першая (М). 11-45 — «Старонкі любімых кніг на экране. «Педагагічная паэма» (М). 13-45 — чэмпіянат свету па хакею з шайбай. СССР — Швецыя (у запісе) (М). 16-45 — праграма перадач. 16-50 — тэлевізійныя навіны (М). 17-00 — «Радзіма». Тэлевізійны маладзёжны клуб. 17-40 — «Панарама навін» 18-00 — чэмпіянат СССР па боксу. Фінал. Перадача з Саратава. 19-30 — фестываль шматсерыйных савецкіх і зарубежных тэлевізійных мастацкіх фільмаў. «Матэ Борш» (Венгрыя). Трэцяя серыя (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — «Сельскі веснік». 22-00 — чэмпіянат свету па хакею з шайбай. ЗША — Канада. Перадача са Стакгольма.

Другая праграма

17-00 — «Актуальныя праблемы эканомікі» (М). 17-30 — «Па музеях і выставачных залах» (М). 19-30 — «Сябры і гады». Мастацкі фільм. 1-я серыя. 20-35 — майстры мастацкага слова. Урыўкі з твораў І. Тургенева чытаюць Алена і Іван Каменскія. 21-30 — у эфіры — «Маладосць». Міжнародная маладзёжная праграма (М).

26 сакавіка

Першая праграма

10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — «Шукальнікі». Перадача з г. Фрунзе. 11-00 — А. Волкаў. «Чараўнік Ізумруднага горада». Тэлевізійны лялечны спектакль. Частка другая (М). 12-00 — на прыз клуба «Залатая шайба». Перадача з Казані. 16-30 — праграма перадач. 16-35 — для дзяцей. Спявае «Усход». Перадача-канцэрт. 17-00 — для школьнікаў. «Беларусь мая родная». Сустрэча пераможцаў конкурсу на лепшае сачыненне з пісьменнікамі Беларусі. 18-00 — чэмпіянат свету па хакею з шайбай. СССР — Фінляндыя. Перадача са Стакгольма. У перапынках — «Панарама навін». 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-15 — тэатр тэлевізійнай навелы А Самсонія. «Паводка» (М). 22-00 — чэмпіянат свету па хакею з шайбай. ЗША — ЧССР. Перадача са Стакгольма.

27 сакавіка

Першая праграма

10-05 — тэлевізійныя навіны (М). 10-15 — чэмпіянат свету па хакею з шайбай СССР — Фінляндыя (у запісе) (М). 11-00 — тэлевізійнае агенцтва «Піянерыя». Перадача з Данецка. 11-30 — «З прыгодай на «ты». Прэм'ера тэлевізійнага мастацкага фільма (Польшча). Першая і другая серыі (М). 12-00 — «Старонкі музычнага календара» (М). 16-10 — праграма перадач. 16-15 — для дзяцей «Глобус, парта, аловак і карта». 16-50 — тэлевізійныя навіны (М). 17-00 — праграма каляровага тэлебачання (М). 18-00 — праграма, прысвечаная Міжнароднаму дню тэатра (М). 19-30 — фестываль шматсерыйных савецкіх і зарубежных тэлевізійных мастацкіх фільмаў. «Матэ Борш». (Венгрыя). Чацвёртая серыя (М). 20-30 — «Час». Інфармацыйная праграма (М). 21-00 — чэмпіянат свету па хакею з шайбай. Канада — Швецыя. Перадача са Стакгольма У перапынках «Панарама навін».

У РЭСПУБЛІКАНСКІМ ГРАМАДСКІМ САВЕЦЕ НАРОДНЫХ УНІВЕРСІТЭТАЎ

Адбылося чарговае пасяджэнне рэспубліканскага грамадскага савета народных універсітэтаў. З дакладам аб задачах грамадскіх саветаў народных універсітэтаў па выкананні рашэння ЦК КП Беларусі «Аб паляпшэнні работы народных універсітэтаў» выступіў старшыня савета акадэмік АН БССР К. І. Лукашоў.

У прынятай пастанове савет вызначыў канкрэтныя меры па далейшым развіцці сеткі народных універсітэтаў, павышэнні ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню заняткаў і палепшэнні кіраўніцтва народнымі універсітэтамі. У навучальна-тэматычныя планы і праграмы ўсіх народных універсітэтаў, з улікам іх профілю, рэкамендавана ўключыць тэмы, прысвечаныя жыццю і дзейнасці, тэарэтычнай спадчыне У. І. Леніна.

Абласным, гарадскім і раённым саветам народных універсітэтаў прапанавана прыняць меры да стварэння галіновых універсітэтаў па розных галінах ведаў, дабіцца, каб у кожным горадзе і раённым цэнтры былі арганізаваны гарадскія і раённыя універсітэты грамадска-палітычных ведаў з аддзяленнямі на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах, саўгасах, па месцы жыхарства працоўных.

Савет абавязаў галіновыя секцыі — грамадска-палітычных, педагагічных, тэхніка-эканамічных, сельскагаспадарчых, прававых ведаў, літаратуры і мастацтва, аховы здароўя — узмацніць навукова-метадычнае кіраўніцтва народнымі універсітэтамі адпаведных галін.

Савет звярнуўся да міністэрстваў і ведамстваў, Белсаўпрофа, творчых саюзаў і іншых арганізацый рэспублікі, якія адказваюць за дзейнасць народных універсітэтаў, з просьбай прыняць неабходныя меры па далейшым удасканаленні навучальна-выхаваўчай работы народных універсітэтаў і ўмацаванні іх матэрыяльна-тэхнічнай базы.

БЕЛТА.

ДОМА

[Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.].

ліся не па небе, а па гулкай, убітай дарозе, разлягаўся навокал, запаўняў усю прастору, разрываючы Германава сэрца дзікім страхам. Жудасна прыгожыя, светла-блакітныя коні з ружовымі грывамі і хвастамі, што плылі, развяваліся на ветры, і крутымі шалёна-чырвонымі вачыма, ашчэранымі буйнымі зубамі... Герман бачыў іх шырокія мускулістыя грудзі, круглыя чыстыя талеркі капытоў, бачыў, як коні імкліва набліжаюцца — тра та-та! — тра-та-та!, — бег па пустой вуліцы, шукаючы, дзе схавацца, але ўсюды было гола, толькі наперадзе стаяла іхняя хата, і калі здавалася, што коні зусім насцігні і вось-вось растопчуць яго, ён нарэшце дабег да хаты і завярнуў за вугал, прыціснуўся спіной да сцяны, раскінуўшы рукі, — і коні пратупацелі далей...

Але зараз жа яны развярнуліся і панеслісь назад, на яго, і ён пабег кругом хаты, хаваючыся за вуглы, і з заміраючым сэрцам нарэшце пачуў, як тупат стаў заціхаць і заціхаць. І тады Герман зайшоў у хату, знайшоў каністру з карасінай і, абліўшы вуглы, падпаліў. Полымя рванула ўгору, быццам выстраліла.

Прачнуўшыся Герман доўга яшчэ слухаў дзікі стукат сэрца, прыпамінаючы гэты незразумелы, жудасна-прыгожы сон. Нават прачнуўшыся, ён да драбніц ясна бачыў і гэтых дзіўна прыгожых коней, і іхні тупат, і той страх, які толькі што перажыў.

І цяпер варта было прыплюшчыць вочы, з'яўляліся гладкія, аж мяняюцца, спіны коней, нерэальна прыгожы блакітны колер іх і дзіка выпучаныя, налітыя кроўю вочы. Толькі цяпер не было начнога страху, а было здзіўленне і радасць. Як гэта было прыгожа! Страшна, але прыгожа. Гэтак страшна і гэтак прыгожа, што сэрца гатова было разарвацца.

І дзіўна, успамінаючы сон, Герман думаў пра Веру. Быццам гэты сон нейкімі нябачнымі ніткамі быў звязаны з Верай.

«Гэта добра, Вера, што ты прыехала,—думаў ён. — Гэта надта добра. Я хачу бачыць цябе. Мне трэба ўбачыць цябе...»

Пакуль Герман узрываў зляжалы, спрасаваны гной — карове падсцілалі льняное клочча — пакамечаны, паблытаны лён, што кожны год заставаўся на сцелішчы і які Лёкса збірала і прывозіла на двор, — пакуль накладваў на насілкі, Лёкса сядзела пад сцяной на слончыку. Супакоеная, трохі размякчаная работай і цёплым днём, радая, што прыехаў сын і яны разам пойдуць на могілкі, яна думала пра сябе, пра Лявона, пра дзяцей, і ёй прыемна было думаць, бо гэтыя думкі адкрывалі ёй яе самую не такой, якой яна прывыкла лічыць сябе — маленькай, слабай, слязлівай, а другой — моцнай, упэўненай, прыгожай. Усё жыццё ёй было некалі думаць пра сябе: маці заўсёды думаюць пра дзяцей, і толькі пасля, калі застанецца час, пра сябе. Такога часу ў яе ніколі не было. У іх было шэсцера дзяцей, калі Лявона не стала, — дзе тут быць другім думкам! І цяпер яна думала пра сябе, глядзела на сябе вачыма стараннага чалавека, і ёй прыемна было бачыць сябе, адзеленую ад паўсядзённых дробязных клопатаў, якімі заўсёды поўна жыццё кожнай бабы, а асабліва жыццё мнагадзетнай бабы-ўдавы.

Яна ўспамінала Лявона, якім ён быў у тыя ваенныя гады і якім застаўся назаўсёды, бачыла сябе самую побач з ім, таксама маладую і здаровую.

Яна сядзела на слончыку, чула цяжкае дыханне Германа, бачыла яго чорныя, сумнаватыя вочы і кроплі поту на ілбе, вялікаваты нос, крэпкія рукі з уздутымі венамі, і бачыла і чула зусім другога Германа.

...Тая ноч была халодная, мяцельная. Яшчэ днём Лёксе стала нядобра: падкочвала пад грудзі пустата, балеў жывот і цягнуў уніз. «Не трэба было падымаць так цяжка, — не першы раз падумала яна за гэты дзень. — Не трэба было брацца за той мяшок».

Лёкса хадзіла шостым і ведала, што азначае гэты цяжар у жываце, і гарачка, і ламата ў спіне.

Канчаўся сёмы месяц, як яна загрубела, і яна думала, што ўсё абыдзецца.

Цэлы дзень была на нагах, выпаліла ў печы, зварыла абед, потым павячэралі... У хаце было нязвыклка прасторна — ажно два дні, як атрад Івана Іванавіча выбраўся з Буднева, пакінуўшы толькі санітарны ўзвод. У іхняй хаце нікога не было. Дзеці—усе ўчацвярых—спалі на палку і на печы, яны з Лявонам — на ложку. Яшчэ заўчора на гэтым ложку спалі санітарка Таццяна і камандзір узвода Асіпчык. Яны нядаўна пажаніліся — чарнабровая смуглявая Таццяна і маўклівы Асіпчык, і Лёкса з Лявонам аддалі ім свой ложак. Самі яны спалі на падлозе.

Пасля глухой поўначы, калі шыбы ў вокнах заледзянелі і хата пачала студзянець, Лёкса разбудзіла Лявона:

— Лявон, Лявон, устань. Я раджаю...

— Ты што, здурнела... Шчэ ж не пара...

— Я ведаю, што не пара, але ведаю, што раджаю... Устань, раскладзі ў печцы... Пастаў грэцца ваду...

— Можа ты яшчэ выдумляеш, — Лявон скоранька ўстаў, вобмацкам знайшоў у печы буркі — яны сушыліся там. Запаліў смаркачык, паставіў яго на комін, укінуў сухіх дровак у печку.

Лёкса ляжала на ложку, цяжка дыхала, пазірала ў столь, слухала, як трашчаць, разгараючыся, дроўкі.

— Разбудзі Маню... Хай збегае па бабу...

— Яна баяцца будзе...

— А як жа без бабы? — Лёкса кусала губы.

Лявон стаў на зачынак, узяў за плячо дачку:

— Маня, устань. Устань, Маня! Збегай па Агеіху. Скажы, хай бяжыць сюды. Маці раджае...

Маня адразу ўсхапілася, як і не спала, пачала скоранька абуванца...

— Адчыні куфар, Лявон. Там, з левага боку, пад прыскрынкам, дзве полкі ёсць, крамныя, дастань іх. Пад імі кужэльныя, тоненькія і іх дастань. Што яшчэ. Ага. прынясі з сянец начоўкі, пастаў ля печкі, хай грэюцца...— Яна закрыла вочы. Лоб яе змакрэў, яго абсыпала потам. Яна ляжала і слухала, як гудзе агонь у печцы і як цёплы дух ідзе на хату. І быццам не чула болю, які працінаў яе ўсю, разламваў на часткі. Ёй прыемна было бачыць Лявона — разгубленага, бездапаможнага, добрага. Ён рэдка калі смяяўся і яшчэ радзей з ёй. Яна паважала яго і трохі баялася. А цяпер ёй было добра з ім, хоць усю яе разламвала на часткі. Яна шкадавала яго. Шкадавала, што ён такі сур'ёзны, і што ён хавае ласку сваю і дабрату і не ведае, што з імі рабіць. Ён, як багаты, які не раздае сваё багацце не таму, што скупы, а таму, што не ведае каму і як аддаць...

Ёй прыйшла ў галаву думка пра тое, што яшчэ пазаўчора на гэтым ложку спалі маладыя, а сёння яна раджае. «Ну і што з таго, што маладыя, ты ж сама не маладая, шостае раджаеш...» — думала яна і зноў успамінала пра тое, што ўсяго пазаўчора на гэтым ложку спалі маладыя.

Страшэнны боль зноў працяў яе ўсю.

— О-ой!

— Крычы, Лёксачка, крычы... Дай я табе падушку падкладу пад спіну... Ямчэй будзе... крычы...

* * * * * * * * * *

— Асцярожна, Лявонка... Галоўку асцярожна... О-о-о-й... Пуп, пуп перавяжы...

Ён кінуўся шукаць нітку — у куфар, у прыскрынак — нідзе не было. У шуфлядцы стала наткнуўся на клубок дратвы. Адкусіў кончык, перацісну? пупавіну.

— Ці жывое хаця?

— Жывое, — Лявон трымаў маленькі ружовы камячок над начоўкамі, абмываў цёплай водой.

У раму акна нехта груба забарабаніў:

— Тушыце агонь! Самалёты!..

— Тушыце... Як жа тушыце?— Ён загарнуў у нейкае лайно дзіця. Схапіў посцілкі, накінуў на адно акно, на другое. Прыслухаўся. Недзе высока чуўся нудны зацяжны гул. Ён прыкметна аддаляўся...

— Божа мой, ці ж яно будзе жыць... Сямімесячнае... Такое малюсенькае. Зялёнае. Мохам аброслае... — Гэта сказала сама Лёкса, ледзь чутна, аднымі губамі. А яно, гэтае зялёнае, аброслае мохам раптам зморшчыла тварык і ні то заплакала, ні то піскнула — раз, другі, трэці...

— Захоча, дык будзе жыць, — сказаў тады Лявон.

У сенцах пачуўся тупат ног. Ішла Маня з бабай Агеіхай.

...Лёкса быццам ачнулася, узняла вочы. Герман стаяў ля шулы, абапёршыся на вілкі, пазіраў на яе.

Яна ўстрапянулася, палезла рукамі пад хустку, папраўляючы валасы, дадумала: «Ці думаў хто тады, што з яго будзе што. Ажно бач, слава богу. Захоча — будзе жыць».

«СЕРАНІСІМА» ТОНЕ

Аб небяспеках, якія пагражаюць гістарычным помнікам і мастацкім скарбам Венецыі, пісалася многа. Друк ужо біў трывогу з прычыны эрозіі каменя ад вады, што прасочваецца, скардзіўся на «смог», які раз'ядае бронзу і мармур, на каварнае ўздзеянне марской солі. Але галоўнае зло да гэтага часу заставалася калі не зусім у ценю, дык і не ў фокусе ўвагі. Сапраўдная трагедыя старажытнай уладарніцы мораў «Серанісімы», як называлі даўней Венецыю, у тым, што яна паступова «тоне». Яе паверхня няўхільна пагружаецца ўніз адносна ўзроўню абмываючага яе Адрыятычнага мора. Апусканне гэта можа ісці да вядомай мяжы, за якой ужо ніякія дамбы і ахоўныя збудаванні не змогуць выратаваць горад ад затаплення. Вучоныя падлічылі, што да 2 000 года ўзровень гістарычнага цэнтра Венецыі апусціцца яшчэ на 30 сантыметраў, а праз 90 гадоў — больш чым на метр.

Сама па сабе гэтая з'ява не новая. Яшчэ ў 1885 годзе было заўважана што каменнае пакрыццё унікальнай па прыгажосці плошчы Святога Марка за 600 гадоў свайго існавання апусцілася на 73 сантыметры. Аднак за апошнія дзесяцігоддзі гэты працэс рэзка паскорыўся. Калі раней ішла гутарка аб немачы, якая паражала мастацкія багацці горада, дык цяпер усур'ёз загаварылі аб набліжэнні зусім рэальнай пагібелі самой «Серанісімы».

На думку спецыялістаў, лёс Венецыі павінен вырашыцца на працягу бліжэйшых 70 гадоў, гэта значыць, практычна на працягу аднаго чалавечага жыцця. Гэты лёс залежыць ад дзвюх сіл, якія дзейнічаюць у адным кірунку: апускання глебы і павышэння ўзроўню мора. Старшыня Асацыяцыі «Венецыя-Серанісіма» інжынер Зуджэніо Міоці, які ўжо даўно займаецца гэтым пытаннем ,падлічыў, што калі сто гадоў назад глеба ў Венецыі апускалася ў год толькі на 1,4 міліметра, дык зараз апусканне пасюрылася да 6 міліметраў, а праз стагоддзе яно перавысіць ужо 15 міліметраў у год.

Што ж рабіць? Ці можна выратаваць Венецыю, гэтую ўвасобленую ў камені казку, ці яна асуджана на пагібель? Вучоныя адказваюць: так, можна, але трэба ўжо, калі неабходныя меры будуць прыняты неадкладна. Будаўніцтва дамбаў і марскіх грэбляў з мэтай перашкодзіць наступленню мора яны лічаць справай нерэальнай і бескарыснай, таму што славутая венецыянская лагуна, пазбаўленая свежых марскіх цячэнняў, непазбежна задыхнулася б і ператварылася ў гіганцкае гнілое балота. На іх думку, трагедыя «Серанісімы» выклікана самімі людзьмі. Яны расхісталі трываласць і падарвалі ўстойлівасць геалагічнага фундамента, на якім узведзена Венецыя. Гутарка ідзе аб ажыццёўленым адводзе рэк, аб чатырох з лішнім тысячах артэзіянскіх шчылін, выкапаных у гэтым раёне, аб эксплуатацыі газавых месцанараджэнняў і г. д. Усё гэта паслабіла глебавы ціск і прывяло да асадкі верхніх пластоў зямлі. Таму ў якасці сродкаў барацьбы прапануецца павысіць гэты ціск шляхам напампоўвання пры дапамозе магутных помпаў марской вады ва ўтвораныя пустоты.

Час не церпіць. Пакуль што справа абмяжоўваецца вучонымі дыскусіямі, і да канкрэтных дзеянняў, мяркуючы па ўсім, яшчэ далёка. «Калі мы хочам, каб венецыянцам не давялося запасіць у скафандры, — піша часопіс «Панарама»,— неабходна неадкладнае ўмяшанне, інакш усялякія вучоныя прагнозы аказуцца непатрэбнымі, а горад загіне».

Ю. ЛАПАЦІН,
карэспандэнт ТАСС.

Рым.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, В. М. АЛАДАЎ, А. Ц. БАЖКО [намеснік галоўнага рэдактара], Б. І. БУР'ЯН, А. І. БУТАКОЎ, Р. С. БЯРОЗКІН К. Л. ГУБАРЭВІЧ, І. М. ДАБРАЛЮБАЎ, В. У. ІВАШЫН, А. С. КАЗЛОЎСКІ, П. М. МАКАЛЬ, У. Л. МЕХАЎ [адказны сакратар], Р. К. САБАЛЕНКА, І. А. САНКОВА, М. Г. ТКАЧОЎ, Ю. М. ЧУРКО, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі—3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара—3-25-25, адказнага сакратара—3-44-04, аддзела літаратуры—3-21-53. аддзела тэатра, кіно і музыкі—3-24-62, аддзела выяўленчага мастацтва, архітэктуры і вытворчай эстэтыкі—3-24-62. аддзела публіцыстыкі—3-22-04, аддзела культуры — 3-22-04 аддзела інфармацыі—3-44-04. выдавецтва — 6-25-19. бухгалтэрыі — 6-25-87

«Литература и искусство»—орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 08574